Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 23 (522) | Субота, 7 чэрвеня 1941 года | Цана 20 кап.

РАБОЧАЯ ТЭМАТЫКА Ў ЛІТАРАТУРЫ

У сярэдзіне лютага гэтага года адбылася XVIII Усесаюзная партыйная канферэнцыя, якая ўзбагаціла грамадска-палітычнае, духоўнае жыццё совецкага народа, а разам з тым і нашу літаратуру.

На партыйнай канферэнцыі былі падведзены вынікі грандыёзнага будаўніцтва, барацьбы і перамог. вызначаны далейшыя задачы пабудовы комунізма.

XVIII Усесаюзная партыйная канферэнцыя адобрыла народнагаспадарчы план бягучага года, а VIII сесія Вярхоўнага Совета СССР зацвердзіла дзяржаўны бюджэт. За выпаўненне задач, пастаўленых партыйнай канферэнцыяй і сесіяй Вярхоўнага Совета, вядзе і будзе весці барацьбу магутны совецкі народ.

Для таго, каб выпаўніць грандыёзныя задачы, пастаўленыя канферэнцыяй і сесіяй, патрэбна не толькі напружанне мускулаў і розуму, не толькі арганізатарскі талент, патрэбна ўменне перамагаць коснасць, знішчаць недахопы, якія ў нас, безумоўна, яшчэ ёсць.

Совецкая літаратура, самая маладая і самая рэвалюцыйная літаратура ў свеце, совецкія пісьменнікі, самыя перадавыя і самыя рэвалюцыйныя пісьменнікі ў свеце, павінны дапамагаць партыі і народу ў іх штодзённай барацьбе за пабудову комунізма.

Лепшы пісьменнік нашай эпохі А. М. Горкі не адзін раз гаварыў, што самае галоўнае, самае асноўнае, чым павінна займацца літаратура, гэта паказваць чалавека працы, творца матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.

Найвялікшыя геніі чалавецтва Ленін і Сталін вучаць совецкіх пісьменнікаў паказваць у сваіх творах герайчныя справы нашага народа, які, заўсёды поўны энергіі, творыць цуды, паказваць лепшых людзей нашай краіны патрыётаў радзімы герояў соцыялістычнай працы, герояў Чырвонай Арміі, легендарных совецкіх палкаводцаў.

Шмат зроблена совецкай літаратурай, але большае прадстаіць зрабіць. Калі мы возьмем беларускую совецкую літаратуру, якая, дзякуючы мудраму праведзенню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, дасягнула свайго росквіту, то ўбачым, што яна ў сваёй аснове з'яўляецца сялянскай літаратурай.

За годы двух сталінскіх пяцігодак, дзякуючы ўвазе, клопатам і кіраўніцтву комуністычнай партыі і асабіста таварыша Сталіна Беларуская ССР ператварылася ў індустрыяльна-калгасную рэспубліку. Вырас рабочы клас. Аднак, у беларускай совецкай літаратуры мы не бачым совецкага рабочага.

Перад беларускай совецкай літаратурай стаіць задача паказу жыцця і дзейнасці перадавога класа — кіраўніка совецкага грамадства, класа, які ўяўляе сілу і магутнасць соцыялістычнай дзяржавы. Для совецкіх пісьменнікаў вядома, што далейшае развіццё совецкага ладу, яго рух к комунізму вызначаюць людзі індустрыі, найбольш арганізаваная частка народа. Рабочыя станкабудаўнічых заводаў, чыгункі, героі соцыялістычнай працы — вось героі совецкіх кніг, раманаў, п'ес, паэм. Гэта зусім не азначае што ў літаратуры не трэба паказваць калгасніка ці інжынера, вучонага ці лётчыка. Справа ідзе аб тым, каб у беларускай совецкай літаратуры паказаць не толькі людзей соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, нашай соцыялістычнай інтэлігенцыі, але і людзей рабочага класа, перадавога класа соцыялістычнага грамадства.

Хацелася-б, каб лепшыя майстры беларускай совецкай літаратуры: Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Міхась Лынькоў, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка і другія прышлі да 25-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі з новымі творамі на рабочую тэматыку, з творамі аб вырасшым у Совецкай Беларусі рабочым класе.

Хіба жыццё і праца совецкага рабочага БССР не могуць паслужыць матэрыялам для вялікага мастацкага твора! Духоўны кругагляд людзей фабрык і заводаў не толькі можа служыць матэрыялам для пісьменніка, але і ўзбагаціць духоўна самога пісьменніка, які возьмецца за гэту пачэсную працу.

«Расказваючы аб фактах, — гаварыў А. М. Горкі, — якія знамянуюць інтэлектуальны рост рабочага фабрык і ператварэнне адвечнага ўласніка ў калектывіста-калгасніка, мы, літаратары, іменна толькі расказваем, вельмі дрэнна малюючы эмацыянальны працэс гэтых пераўтварэнняў».

Дзе больш і ярчэй праяўляецца калектывізм, як не на фабрыцы і заводзе. Мараль чалавека буйной індустрыі, дзе народжана глыбокае пачуццё калектывізму, у совецкай дзяржаве з'яўляецца пануючай Рабочы клас у нашай краіне вядзе за сабою ўвесь народ. Рабочы клас нашай радзімы вылучыў на гістарычную арэну такую магутную прагрэсіўную сілу, як партыя Леніна —Сталіна, якая вядзе совецкі народ ад перамогі да перамогі.

Праца і дысцыпліна, калектыўная ўласнасць — вось на што павінна быць звернута ўвага пры напісанні мастацкіх твораў. Па адносінах да працы і дысцыпліны пазнаецца ўнутраны свет чалавека, яго маральны воблік.

Совецкія пісьменнікі, патрыёты сваёй радзімы, знойдуць сілы і сродкі для стварэння мастацкай літаратуры аб рабочым класе якая будзе дапамагаць совецкім людзям весці барацьбу за вялікую справу Леніна — Сталіна, за комунізм.

Мікола Ільінскі

Шчасце

Апавяданне

— Ну, трэба ісці... — гукнуў Раман, зірнуўшы на ходзікі, і накіраваўся ў кут, дзе ў цмяным змроку ранку паблісквала лапата.

Гэта «трэба ісці» ён гаварыў сотні разоў, ідучы араць ці касіць, ці едучы ў лес па дровы. Але ўсе гэтыя работы былі звыклымі, знаёмымі: пад «трэба» была канкрэтная сапраўднасць, поўная жывых вобразаў, успамінаў і ўяўленняў, і таму словы гэтыя заўсёды былі поўнымі сэнсу і пачуцця. А зараз яны прагучалі пуста і як дзіпячыя качулачкі прагрукацелі па падлозе хаты, не выклікаючы ніякай думкі.

Мусіць, гэта пустата ў пачуццях рабіла і тое, што Раману не хацелася ісці, і ён, каб адцягнуць час, яшчэ раз агледзеў сто разоў аглядане, войстрае, як брытва, лязо лапаты; яшчэ раз абмацаў з вечара пакладзены ў кішэню браваркі напілак і, паўтарыўшы: — Трэба ісці,— узяўся за клямку... Не паспеў ён яе націснуць, як пачуў з полага слабы, але ўсхваляваны голас:

— Пачакай... Раман...

Ці раз так спыняў яго бацька і ці раз Раман, спяшаючыся, не звяртаў увагі на слабыя воклічы калекага старога? Аднак, на гэты раз у тоне старога было нешта такое, што прымусіла Рамана зняць руку з клямкі, павярнуцца і падыйсці.

Стары відавочна хваляваўся. Вусны яго торгаліся, усохшая за пятнаццаць год амаль поўнай бяздзейнасці рука падымалася ўгору і зноў беспарадна ападала, і толькі ў вачах было надзвычайнае напружанне, амаль такое-ж самае, якое не раз заўважаў Раман, калі бацька спрабаваў зрабіць самастойна некалькі крокаў. Толькі цяпер у іх замест болю загараліся, згасалі і зноў яшчэ мацней разгараліся агні ўпартай думкі.

— Ну? Чаго? — з лёгкай дакукай спытаўся Раман, і стары загаварыў:

— Раман... Сынок... бачыш, — паказаў ён на свае ногі. — гэта балота... Гэта яно мяне скалечыла. Гэта... Праз яго я пятнаццаць год нясу гэту пакуту... Ды ці сам я?.. Усе наўкол мяне... І ты, і Марына, і ўсе... Балота! Яно... Гэта найгоршы наш вораг... А зараз, — на вачах старога з'явіліся слёзы, — ён там, у Крэмлі, усё бачыць... Дык вось... Ідзі, Раман... Ідзі, сынок! За мяне, за ўсіх, за свае пакуты на гэтай багне... Ты яго, гэта балота...— Стары ўзняў складзеныя для крыжа пакалечаныя хваробай вузлаватыя пальцы, але яны зараз-жа расчапіліся і ён, беспарадна махнуўшы рукой, сказаў: — Гэта ні да чаго... У Крэмлі ўсё бачаць. Ідзі, Раман... і... лепш за ўсіх... ты старайся.

Стары ў знямозе адкінуўся на свой сяннік. Раман глядзеў, як пад расхрыстанай сарочкай бацькі ўздымаліся і ападалі запалыя грудзі, і ўпершыню адчуў нейкі салодкі боль. Яму захацелася абхапіць сівую бацькаву галаву, прыціснуць яе да грудзей і гладзіць яе, песціць. Але ён стрымаў гэта імкненне і амаль груба адказаў:

— Чаго там, — калі іду на балота, значыць не ў гарадкі гуляць. — І ўжо мякчэй дадаў: — Канцы зараз балоту. Ты, бацька, не сумнявайся.

Разгублены і збянтэжаны крочыў Раман у напрамку балота. Ён не заўважаў, як са шматлікіх хат калгаса выходзілі мужчыны, жанчыны, старыя і маладыя; збіраліся ў гурбы, строіліся і дружным, гаманкім строем ішлі ў адным з ім напрамку...

Бязмежная роўнядзь балота была зацягнута густой рэдзю туманнай імжы. Няўтульнае, засланае рудавата-зялёным мохам, з якога па каліву вытыркаліся войстранькія стрэлкі веснавога асоту, ды дзе-ні-дзе разгортвалі першыя лісточкі чэмяр ды шчаўе, яно сустрэла Рамана цяжкой халоднай парнасцю. Важкія хмары шчыльнай апонай ахуталі неба і, здавалася, зліліся з надбалотным туманам у адно вільготнае пухкае месіва, якое прагна ўбірае ў сябе мокрае тарфянішча. Яно чмякала пад нагамі, хапала за пасталы, і Раману здалося, што балота баіцца яго і хоча затрымаць і не пусціць у свае нетры.

Ён не бачыў, як, дасягнуўшы балота, змешваліся ў цяжкой хадзе стройныя рады калгаснікаў, але, пачуўшы, як замітусіліся з пранэзлівым крыкам, рэжучы трапяткімі крыллямі паветра, кнігаўкі, зразумеў, што наступ на балота пачаўся.

Адылі думка гэта праплыла недзе паўз край свядомасці, заклапочанай чымсьці зусім нечаканым, што ўвайшло ў яе разам са словамі старога бацькі. Ён намагаўся дакладна сфармуліраваць гэту думку, паставіць яе ў рад з іншымі гаспадарчымі ды бытавымі меркаваннямі, а яна набухала, распаўзалася і выслізвала з свядомасці, каб зноў, сабраўшыся ў нейкі пачварлівы камяк, дрэнчыць пачуццё сваёй невыразнасцю і няўлоўнасцю.

Раману было ясна цяпер, што простая і разам з тым такая нязвыкла-загадкавая справа асушкі балота зрабілася для яго нечым асабліва важным, неадкладным і, як жыццё, патрэбным.

Так, з разгубленымі думкамі, дайшоў ён і да месца будучага калектара. Тут, заняты адмерваннем участка для дзённай працы, ён на некаторы час вярнуў страчаную гаспадарчую разважнасць. Але, як толькі змаху ўдарыў у балотнае махаўё і з-пад лапаты паляцелі рудыя пырскі тарфяной жыжкі, яму здалося, што лязо ўвайшло не ў торф, а ў грудзі нейкага адвечнага страшнага ворага, які ўжо зараз не мае і не здолее сабраць сіл абараніцца ад непераможнага наступу чалавека.

З шалёнай асалодай сек Раман войстрым лязом ворага, з асалодай вывarочваў на бераг калектара аграмадныя, цяжкія скібы налітага вадой торфу...

Аднак, адчуванне лёгкай перамогі хутка пахіснулася. У вырытую яміну набягала вада, яна размывала торф і скібы рабіліся меншымі, работа пасоўвалася марудней, — балота не здавалася. Калі-ж, вырыўшы канаву да патрэбнай глыбіні, Раман выходзіў з яе і жорсткі сівер спавіваў спіжай і дубяніў мокрыя ногі, яго пачынала агортваць злосць, і ён зноў і зноў сек і вывapaчваў на бераг торф... Ад прамокшай пад дажджом адзежыны падымалася пара, і тады Раман адчуваў, што перамагае ён...

Калі ў канцы дня дзесятнік абмераў раманаву выпрацоўку, то выявілася, што ён выкінуў трыццаць чатыры кубаметры торфу. На момант гэта суцешыла Рамана. Але, глянуўшы на бязмежны абшар балота, параўнальна з якім яго праца выглядала толькі маленькай чорненькай рыскай, ён да болю сцяў зубы ва ўзрослай нянавісці да ворага; і жаданне помсты з новай сілай агарнула яго... Прышоўшы дадому, ён на маўклівае запытанне бацькаўскіх вачэй толькі злосна буркнуў:

— Багна чортава!.. — і, моўчкі павячэраўшы, лёг спаць.

На другі дзень прадаўжалася тое самае маўклівае, часам шалёна-прыемнае, часам распачліва-злоснае змаганне з торфам і вадой. Але выпрацоўка значна павялічылася: ён ужо выкінуў пяцьдзесят сем кубаметраў.

Аднак, на трэці дзень, пасля двух гадзін работы, Рамана раптам сустрэў плывун. Цяжкі, паўзучы, ён ляжаў пад тонкім — у адну лапату — пластом торфу.

З нечалавечым намаганнем выкідваў Раман поўную лапату плывуну, але ў наступны момант вызваленае ад грунту месца зноў заплывала; з ледзь чутным чвяканнем адплывалі берагі канавы і здавалася, няма такой сілы, якая здолела-б выбраць усё гэта месіва, што плыве, паўзе, засмактвае ногі і імкнецца праглынуць і грабара, і яго працу.

Усё-ж чалавек патроху перамагаў і на месца адчаю, які агарнуў Рамана ў пачатку змагання з плывуном, прышла злобная ўпартасць. Не разгінаючыся, не дазваляючы сабе ні перадыхнуць, ні закурыць, ён выкідваў і выкідваў вязкі плывун, спяшаючыся шпаркай працай апярэдзіць яго павольны рух.

У самы разгар гэтага зацятага змагання Раман пачуў над сабою голас:

— Адпачынь хіба, Раман, крыху!

Ён падняў галаву і ўбачыў на беразе канавы палітрука, старшыню калгаса і парторга. Апошні трымаў чырвоны сцяг на даўгім шастку, а з усіх бакоў, угрузаючы ў балоце беглі калгаснікі.

Раман неўразумена раскрыў вочы і моўчкі глядзеў на людзей, на сцяг не цямячы яшчэ, што здарылася, чаго ім ад яго трэба. Але ў наступны момант неўразуменне развеялася: са слоў палітрука ён зразумеў, што ён — першы стахановец на асушцы, што яму даюць пераходны калгасны сцяг перадавіка і прэміруюць грашмі. І шмат яшчэ знаёмых ужо слоў пачуў зараз Раман аб спаборніцтве, аб меліярацыі, аб асваенні новых зямель. І ўсе яны нейк па-новаму даходзілі да збянтэжанай свядомасці Рамана, і ў яго паволі пранікала адчуванне, што ён зрабіў нешта вельмі патрэбнае і важнае, за што яго і ўшанавалі вялікім гонарам, і што зараз толькі ад яго, ад аднаго яго залежыць утрымаць за сабой гэта пачэснае месца.

Рамана віншавалі, яму паціскалі рукі — і шчыра, і тоячы зайздрасць. Ён аднолькава разгублена адказваў і адным і другім... Гаманкі натоўп разышоўся, а ён усё яшчэ камечыў пяцідзесяцірублёвую паперку, ды пагладаў на кавалак чырвонага паркалю, што так весела пялёхаўся пад ветрам на ўткнутым у балота шастку...

Раптам вецер раздзёр апону хмар і сонца на некалькі хвілін заліло яркім святлом аднастайна панылы, мокры балотны абшар з дзесяткамі людскіх постацей на ім. І тут Раман усёй сваёй істотай адчуў, што ўсе гэтыя людзі, як і ён, вядуць жорсткае змаганне з адвечным сваім ворагам — балотам. Толькі гэта змаганне не ёсць звычайная помста за шматгадовы здзек, а гэта ёсць барацьба за зямлю, за ўраджай, за заможнае жыццё, і што ён да гэтага часу не разумеў усёй велічы гэтага змагання. Раман адчуў сябе, як адчувае хлапчук, злоўлены ў чужым садзе ў яблыках, і чырвань сораму на хвіліну заліла яго зарослы шчацінием твар і абветраную шыю. Але ўжо ў наступны момант шырокая ўсмешка расплылася ў яго па твары, а ў свядомасць прасякла супакойваючая думка:

— Як-бы там ні было, а лепшы і першы!

Ён ласкава зірнуў на чырвань пераходнага сцягу і ўжо ўголас дадаў:

— Не, дружа! Я цябе нікому не аддам.

І, нібы спалохаўшыся, што на ўрачыстасць страчана занадта шмат часу, ён шпарка схаваў у шапку пакамечаную паперку і саскочыў у канаву... Ад гэтага выпадку і настрой, і адносіны Рамана да балота і працы на ім зусім змяніліся — месца помслівай злобы заступіла гаспадарчая разважнасць. Таксама, як і раней, ён не траціў часу на адпачынак і закуркі, але зараз ён не траціў ужо і сіл на злобу. Кожны яго рух быў прадуманы і мэтазгодны, і выпрацоўка яго расла, а разам з гэтым на сэрцы штодня рабілася радасней і лагодней.

Зараз ён ужо не ішоў на работу і з работы ў адзіноце, а гуртам з іншымі калгаснікамі. Весела кпіў з некаторых з іх, што няўдала стараліся перамагчы яго, дапамагаў некаторым парадай, як лепш вайстрыць лапату, як лепш выбіраць грунт.

Прыходзячы дадому, ён апавядаў бацьку пра свае дасягненні, пра поспехі, якіх дамогся калгас у асушцы.

Погляд на бацьку, як на пакутны цяжар, які на працягу доўгіх год трэба несці ў імя недарэчнага сыновага абавязку, зараз знік. Раман, як і ў маленстве, зноў бачыў перад сабою чалавека якому ён абавязан сваім з'яўленнем на свет, сваім выхаваннем. Ён адчуў родную блізкасць да гэтага, пакалечанага цяжкой працай, нядоляй ды балотам, чалавека, і яму было прыемна бачыць радаснае хваляванне старога, калі той даведваўся, як змяншаецца вада, як здаецца балота перад чалавечым наступам.

Нарэшце, надышоў час, калі значна больш, чым было вызначана па плану, абшар балота ляжаў пасечаны чорнымі пасамі калектараў, ад якіх імкліва разбягаліся роўныя стрэлкі асушальнікаў.

Балота прысмірнела. Яно не хапала ўжо за ногі, не засмактвала; знікла і яго хціўнае чмяканне. І, здавалася, зямля, атрымаўшы ад чалавека дапамогу і вызваліўшыся ад балотнай навалы, растуляе свае абдымкі чалавечай працы і насенню, каб пасля вярнуць іх сваёй падзякай — багатым ураджаем.

Па сканчэнні асушкі Раман быў прызначан за брыгадзіра грабароў, якія выяздзжалі на рыццё магістральнага канала.

У выходны дзень, перад выездам, ён запрасіў да сябе грабароў сваёй брыгады. Пасля некалькіх чарак гаворка зрабілася шумнай. Кожны хацеў давесці, што ён добра працаваў на асушцы; кожны выхваляўся сваімі дасягненнямі. Каму не было чым асабліва пахваліцца, той спасылаўся на карчы, плывуны, ваду ды іншыя прычыны, якіх яму, нібы, заўсёды траплялася больш, чым іншым. Усё гаманлівей і гаманлівей рабілася ў хаце, як раптам усе зніякавелі і сціхлі...

Раманаў бацька, які сядзеў у чырвоным куце, апусціў на заліты гарэлкаю стол галаву і галосна рыдаў; худыя касцістыя плечы ўздрыгвалі пад выцвілай сарочкай.

Калі Раман кінуўся суцяшаць яго то калека падняў зморшчаны, заліты беспараднымі старэчымі слязамі твар і голасам, які перапыняў стрымліваемыя рыданні, прамовіў:

— Шчаслівыя!.. Шча-слі-вы-я-я... Каб мне ногі... Ногі-б мне толькі... Я-ж бы!.. — і ён зноў беспарадна зарыдаў.

Цішыню, якая панавала ў хаце, парушалі толькі гэтыя рыданні.

Толькі-што гэткія вясёлыя і зухаватыя грабары сядзелі моўчкі, упёршы вочы; некаторыя збянтэжана пераглядваліся — ім было сорамна за сваю недалікатнасць: як маглі яны выхваляцца сваім шчасцем магчымасці ўласнымі рукамі здабываць новае, свабоднае ад балотных пакут, заможнае жыццё, прымаць пільны ўдзел у вялікай усенароднай справе, — выхваляцца гэтым сваім шчасцем у прысутнасці няшчаснага, пазбаўленага гэтай магчымасці старога! Асабліва-ж несамавіта адчувалі сябе тыя, хто не выкарыстаў гэтай магчымасці па поўную меру.

Даманавіцкі раён, май 1941 года.



З энтузіязмам прайшла падпіска на Пазыку трэцяй пяцігодкі (выпуск чацвертага года) у Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР. На здымку: момант падпіскі на пазыку. За сталом (злева направа) пісьменнікі **М. Лынькоў, В. Вольскі, Л. Кацовіч, П. Глебка, К. Чорны і П. Броўка.**

Фота І. Каплінскага.

Работнікі літаратуры і мастацтваў з энтузіязмам падпісваюцца на Пазыку трэцяй пяцігодкі (выпуск чацвертага года)

У пісьменнікаў сталіцы

2 чэрвеня, 6 гадзін вечара. У зале Дома пісьменніка ў Мінску сабраліся пісьменнікі, супрацоўнікі праўлення ССП БССР, рэдакцый журнала «Полымя рэвалюцыі» і газеты «Літаратура і мастацтва», Літфонда, Упраўлення па ахове аўтарскіх правоў.

Радыё прынесла радаснае паведамленне — совецкі ўрад, выражаючы жаданне ўсяго вялікага совецкага народа, пастанавіў выпусціць новую пазыку, накіраваную на далейшае ўмацаванне гаспадарчай і абароннай магутнасці краіны соцыялізма, на дасягненне новых перамог комунізма, — Пазыку трэцяй сталінскай пяцігодкі (выпуск чацвертага года).

Узнікае кароткі мітынг. Выступаюць пісьменнікі Кузьма Чорны, Пятро Глебка, Міхась Клімковіч, М. Груб'ян. Выступаўшыя з вялікім уздымам гавораць аб бліскучых перамогах соцыялізма, цудоўна змяняючых аблічча нашай зямлі: аб народным руху па асушцы балот, аб бурным росце прамысловасці, аб поспехах сельскай гаспадаркі, росквіце культуры. Аднадушна прымаецца рэзалюцыя, у якой пісьменнікі горача вітаюць выпуск новай пазыкі.

Адразу-ж пачынаецца падпіска на пазыку. Народны паэт БССР Якуб Колас падпісваецца на 7.500 рублёў, лаурэат Сталінскай прэміі Кандрат Крапіва — на 7.500 рублёў. На 4.000 рублёў кожны падпісаліся Міхась Лынькоў і Віталій Вольскі. На 3.000 рублёў кожны падпісаліся Пятрусь Броўка, Кузьма Чорны, Пятро Глебка. К 8 гадзінам вечара пераважная большасць пісьменнікаў і супрацоўнікаў апарата ССП аформіла сваю падпіску.

Падпіска на пазыку ў калектыве ССП БССР закончана Агульная сума падпіскі пісьменнікаў складае 46.300 рублёў, сума падпіскі супрацоўнікаў — 21.870 рублёў, што складае 117,6 проц. месячнай зарплаты.

А. Б.

Падпіска мастакоў

Адразу-ж пасля перадачы па радыё пастановы ўрада аб выпуску Пазыкі трэцяй пяцігодкі (выпуск чацвертага года) мастакі гор. Мінска сабраліся ў Доме мастака на мітынг. Кароткі даклад аб значэнні пазык у справе ўмацавання магутнасці краіны соцыялізма зрабіў старшыня праўлення Саюза совецкіх мастакоў БССР тав. Рубінштэйн.

Пасля даклада пачалася падпіска. Першым запісваецца ў падпісны ліст прозвішча скульптара-ордэнаносца, засл. дзеяча мастацтваў БССР З. Азгур, які прыслаў тэлеграму аб падпісцы на 2.000 рублёў. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР А. Грубэ падпісаўся на 1.500 рублёў, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР А. Бембель—на 1.000 рублёў.

На працягу 2 і 3 чэрвеня падпіска сярод мастакоў Мінска была закончана. Падпісалася 56 чалавек, фонд сярэдняй месячнай зарплаты якіх складае 33 тысячы рублёў. Падпіска складае больш 42 тысяч рублёў.

І. М.

Месячны заработак у пазыку дзяржаве

З радасцю сустрэлі работнікі Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР паведамленне аб выпуску новай дзяржаўнай пазыкі

Шэсць гадзін вечара. Уключан радыёпрыёмнік. Усе ўважліва слухаюць перадачу тэкста пастановы ўрада аб выпуску пазыкі. Пасля радыёперадачы ўзнікае мітынг. Тав. Генін гаворыць аб значэнні пазыкі ва ўмацаванні абараназдольнасці нашай радзімы і паляпшэнні дабрабыту працоўных.

Тав. Бойген расказвае прысутным аб буйных выйгрышах, якія выпалі на яго долю: 7.000 рублёў выйграў ён, пачынаючы з 1934 года.

Комуністы падпісваюцца першымі і заклікаюць работнікаў апарата наследваць іх прыкладу.

К 7 гадзінам вечара падпіскай было ахоплена 33 чалавекі на суму 19.300 рублёў, што складае 93 проц. месячнай зарплаты.

А. В.

У кіностудыі „Совецкая Беларусь“

З пачуццём глыбокага задавальнення сустрэў калектыў работнікаў кіностудыі «Совецкая Беларусь» паведамленне аб выпуску Пазыкі трэцяй сталінскай пяцігодкі (выпуск чацвертага года). Роўна ў 18 гадзін у кіноатэлье пачаўся мітынг.

Адразу-ж пасля мітынга пачалася падпіска. Большасць работнікаў студыі падпісалася на 100 проц. месячнай зарплаты. Заслужаныя дзеячы мастацтваў БССР —рэжысёры В. Корш-Саблін і Ю. Тарыч падпісаліся на 1.800 рублёў кожны; рэжысёр І. Анненскі—на 1.600 рублёў, кінодраматург Л. Кацовіч — на 3.000 рублёў, рэжысёр С. Наўроцкі — на 1.400 рублёў і г. д.

Усяго падпісалася 170 чалавек на суму 85.750 рублёў.

М. Б.

Вялікі патрыятычны ўздым

Як толькі разнеслася вестка аб тым, што ўрад абвясціў пастанову аб выпуску дзяржаўнай Пазыкі трэцяй пяцігодкі (выпуск чацвертага года), у Беластоку ў той-жа дзень з вялікім уздымам прайшлі мітынгі работнікаў мастацтваў і пісьменнікаў.

Мітынг у Доме пісьменніка адкрыў дэпутат Вярхоўнага Совета СССР паэт Філіп Пестрак. Ён заклікаў усіх пісьменнікаў аднадушна падпісацца на пазыку, з чэсцю выканаць свой грамадзянскі абавязак. Пісьменнікі Беластока горача падтрымалі гэты заклік. Выступаўшыя таварышы гаварылі, што актыўная і арганізаваная падпіска на пазыку дасць новыя сродкі на ўмацаванне нашай герайчнай Чырвонай Арміі, яе баявой тэхнікі. Совецкі Саюз стаў сапраўднай бацькаўшчынай для тых, хто яшчэ нядаўна пакутваў ва ўмовах капіталізма І вялікае пачуццё гордасці напаўняе сэрца кожнага, хто сёння разам з усім совецкім народам працуе на карысць сваёй радзімы і ўкладае ўсе свае сілы і здольнасці ў яе моц і працвітанне.

Пасля мітынга пісьменнікі падпісаліся на пазыку на суму, перавышаючую 7 тысяч рублёў. Ф Пестрак падпісаўся на 800 рублёў, М Танк — на 700, Д. Сфард і Б. Геллер—на 500 руб. кожны.

Узорна прайшла падпіска на пазыку сярод работнікаў Дома народнай творчасці, які поўнасцю закончыў падпіску ў 7 гадзін вечара 2 чэрвеня, сярод работнікаў аддзела мастацтваў, філармоніі, сімфанічнага аркестра, эстрады, музычнай школы і вучылішча. Усе гэтыя калектывы поўнасцю падпісаліся на 100 проц. свайго месячнага заработку.

Сярод мастакоў Беластока на 3 чэрвеня падпіска складала 16.000 рублёў. Мастакі Красоўскі, Малярэвіч, Мессер, Ляндау, Берман, Кпэчаноўскі падпісаліся на 750 рублёў кожны.

Калектыў Рускага тэатра БССР, які знаходзіцца на гастролях у Беластоку, падпісаўся на 100 проц. месячнага заработку і выклікаў на спаборніцтва на лепшае размяшчэнне пазыкі Польскі тэатр БССР, які знаходзіцца зараз у Мінску.

В. ЦІМСКІ.

Беласток. (Наш кар.).

Узнагароджанне работнікаў мастацтваў Ваенным Советам ЗахАВА

Ваенны Совет Заходняй Асобай Ваеннай Акругі ў спецыяльным загадзе адзначыў шэфскую работу саюзаў работнікаў мастацтваў Беларускай ССР, Смаленскай області РСФСР і раду тэатральных калектываў Масквы па культурна-вілюўшчнаму абслугоўванню часцей акругі і практычнай дапамозе чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці.

Рад артыстаў, педагогаў, кіраўнікоў тэатральных прадпрыемстваў і профработнікаў узнагароджаны граматамі Ваеннага Совета ЗахАВА, многім абвешчаны падзякі. Усяго ўзнагароджана звыш 150 асоб.

Сярод узнагароджаных граматамі Ваеннага Совета ЗахАВА народная артыстка СССР О. Кніппер-Чэхава, народная артыстка СССР Л. Александроўская, народныя артысты БССР Г. Глебаў, В. Уладамірскі, І. Ждановіч, А. Ільінскі, П. Малчанаў, Д. Орлоў, Г. Грыгоніс, заслужаныя артысты БССР М. Дзянісаў, І. Балоцін, Л. Аляксеева, Л. Ржэцкая, М. Моін, А. Трэпель, А. Астахаў, С. Бірыла, О. Галіна, артысты З. Браварская, К. Мулер, Адамантава, Е. Станюта, Троіцкая, Скапескі, педагогі А. Бяссмертны, Л. Шварц, Б. Грымбліт, А. Карповіч, Б. Смольскі і рад артыстаў ГАБТ СССР, МХАТ СССР і Дзяржаўнага музычнага тэатра імя В. Неміровіча-Данчэнкі.

У заключнай частцы свайго загаду Ваенны Совет ЗахАВА выказаў упэўненасць, што работнікі мастацтваў: артысты, музыканты, педагогі сваёй далейшай работай яшчэ больш умацуюць сувязь з часцямі акругі і ўзмоцняць дапамогу камандаванню часцей, паліторганам і культасветным установам акругі ў мастацка-палітычным выхаванні чырвонаармейцаў і начальніцкага складу.

В. Г.

Хроніка падпіскі

⊙ Калектыў Дзяржаўнай філармоніі БССР налічвае 257 чалавек, месячны фонд заработнай платы якіх складае 115.795 рублёў. На 5 чэрвеня падпісаліся на пазыку 240 чалавек на суму 91.035 рублёў. Пераважная большасць падпісалася на 100 процантаў месячнага заработку.

⊙ 71 чалавек Дзяржаўнай эстрады БССР падпісаліся на пазыку на 45.925 рублёў пры фондзе зарплаты ў 58.315 рублёў. Падпіскай не ахоплена яшчэ 33 чалавекі.

⊙ Па калектыву Дзяржаўнага выдавецтва БССР з 102 супрацоўнікаў падпіскай на пазыку ахоплена 98. На 5 чэрвеня сума падпіскі дасягнула 45.965 рублёў.

⊙ Калектыў Дзяржаўнага джаз-аркестра пад кіраваннем Эдзі Рознера закончыў падпіску на Пазыку трэцяй пяцігодкі (выпуск чацвертага года). Усе супрацоўні[кі] калектыва падпісаліся на 100 проц. сва[й]го месячнага акладу, што складае 50.0[...] рублёў.

⊙ Па Саюзу совецкіх кампазіта[раў] БССР сума падпіскі на пазыку дася[гнула] 25.300 рублёў. Лаурэат Сталінскай [прэ]міі тав. Багатыроў падпісаўся на [...] рублёў і ўсю гэту суму ўнёс н[аяўнымі] грашыма.

⊙ Поўнасцю закончана па[дпіска на] пазыку па калектыву Дзяржаўн[ага ...]скага тэатра БССР. Сума падпі[скі] 38.800 рублёў — 93 проц. ф[онду месяч]най заработнай платы.

Наталья Арсеньева

Новыя вершы

Не буду больш!

Я, як жоўтая восень,
стаю над жыццём
і гляджу на яго,
хоць наўкола зьзянне.
«Маладым паэтам».

Не, я не буду больш стаяць
Па-над жыццём асенняй мглою,
і ліра спеўная мая
Напэўна будзе пець другое.
Калісь, даўней, жывую медзь
Я йшла збіраць з пажоўклых клёнаў,
Кідала срэбрам па вадзе
Замест ірвучыхся праклёнаў.
Я жоўтай восенню плыла
Над шэрай прасцінкай загонаў,
І быў мой дзень
зусім, як мгла:
Такі-ж сівы,
пусты,
бязмоўны.
Цяпер інакш, цяпер жыццё
Гудзе вясеннім буралом,
І шчасце ў сэрцы не гасне,
Яно заўсёды ў ім, як дома.
І столькі новых яркіх спраў
Рунее выплыўшым калоссем
У палях шырокіх,
што ўжо я
не змоўкну так,
як моўкне
восень.

1940.

Пасяўная

Чуць дзень прамыў расой расніцы,
Яшчэ ўсё неба у агні,
А ўжо калышыцца, звініць
Калгасніц песня ў стэпе... Узбіцца
Яна маніцца ў неба ўгар
І... апалае зноў, як камень.
За ўзгоркам майскімі жукамі
Гудуць гулліва трактары,
Гудуць, паўзуць і рыюць, рыюць
Вятрамі змецены абшар...
Міне паўдня... згарыць пажар
Вячорных хмар і ноч накрые
Густым туманам палыны, —
Не заціхае гул сталёвы.
Паўзуць машыны ў змрок ліловы,
І будуць рыпці ў ім яны.
Аж да-сыта буйной пшаніцай
Накормяць чорную раллю,
Маторы сілу пераллюць
У кроў пяжарнае зямліцы.
Дождж серабром асыпле ўсё...
І ізумрудна зарунее
Надзея, радасць вольных жнеяў —
Густой пшаніцы калассё.
Калі-ж спякотны, мёдны ліпень
Датхнецца коласа агнём, —
Мы раззалочаным зярнём
Краіну родную засыплем!

Самалёты

У сінім сонечным прасторы
Без узгоркаў, без равоў
Крыллі моцныя разгорнем,
Акунёмся з галавой!

Гэй, віхор, давай паспорым,
Хто герой, чыя ўзяла?
Уецца, гіне пасма бору
Пад нагамі... Клін сяла,
Шкло азёраў, хустка ворнай
Чорна-шоўкавай зямлі...

Неспакойна, непакорна
Свішча вецер у крыллі!
Смела, смела ўгору, ўгору,
У блакітных у палях
Шум ўсхвалёваных матораў
Паміж зораў распыляць!

Вышываць, пісаць узоры
Па нябеснай па канве
І забыўшы ўсякі сорам,
Уніз ляцець на галаве!

Мерацъ спраўна, роўна, скора
Хмарау мора з краю ў край.
Угору, ўгору! Чуеш, вораг?
Мы на варце, дык і знай!

Вясна ў стэпу

Лінуў, рынуў з ветрам гонкім
Гукаў рой, аплёў, як ніці,
Пералівна,
тонка,
звонка
Звоняць жаўранкі ў блакіце.
На зялёненькай па скрыпцы
Смыкам светлым сонца водзіць.
Яснай радасцю іскрыцца
Усё...
... Мне весела... і годзе!
Васількова сіні,
сіні
Вольны стэп — куды ні глянеш.
У шэрым летапісным пальне
Трактары гудуць да ранняй.
Рэжуць,
рэжуць
лемяхамі
Чарназёмныя... Пасля ўпішна
Ужо здалёк ды не ўпяміць —
Ці вясною, ці зімою,
Ці пшаніцай серабранай
Набрыдзе дзесь далёка,
Ці вясновым сокам п'яным
Захлынуўся наўрокам?
Ці спаборніцца з ветрам
На прасторы ніў калгасных.
Хто-ж іх знае...
А ў паветры
І ў душы так ясна,
ясна!

1941.

Максім Танк

За высату 429

Ён танкі вёў праз надаўбы
на доты,
шлях прабіваў пяхоце за раку.
Пад шквалам белафінскіх куль
ён паў,
штурмуючы
варожыя высоты.

Байцоў пахіленых убачыў над сабой,
крыві распырсканыя зоры на граніце
Пазнаў таварышоў:
— Смялей ідзіце
за Сталіна,
за бацькаўшчыну ў бой!
Паўночны вецер галасіў і плакаў,
снег занасіў і нас, і буралом.
Капаць магілу часу не было —
тры дні
бесперапынная атака.

Тры дні паўзлі праз ямы і агонь.
І кожны дзень быў днём геройства,
славы —
бо на гары, якую штурмаваў ён,
мы пакляліся пахаваць яго.
І вораг мусіў адступіць разбіты.
На міг палярная застыла цішыня.
Высокая
карэльская сасна
вітала нас на высаце здабытай.
Апошні гулка прагрымеў салют....
І калі ранні змрок развеяў вецер,
ўсім стала ясна,
радасна на сэрцы,
навокал бачачы свабодную зямлю.
Беласток, 1941.

Конкурс на выкананне твораў Лермантава

Рыхтуючыся да лермантаўскіх дзён, Беластоцкі Дом народнай творчасці праводзіць конкурс на лепшае выкананне твораў вялікага паэта. У конкурсе ўдзельнічаюць мастацкія самадзейныя калектывы і выканаўцы: чытальнікі, дэкламатары.

Беласток. (Наш кар.).

Новыя члены ССП БССР

І. Эміот

Сярод маладых яўрэйскіх паэтаў б. Польскай дзяржавы І. Эміот з першых-жа крокаў вылучыўся сваім рэфлексіўна-паглыбленым лірызмам, сваім непасрэдным успрыняццем танчэйшых нюансаў чалавечай душы і глыбокім пранікненнем у корань кожнай з'явы. Эміот ніколі не спыняўся на настроях проста радасці ці гора, кахання ці нянавісці,—ён заўсёды грунтаваўся на вытоку кожнай з'явы. Пры гэтым яго паэтычны падыход да з'яў ніколі не быў чыста разумовым альбо чыста эмацыянальным, а сінтэтычным спалучэннем таго і другога. Мэтанакіраванасці яго мыслі ўласціва шмат сардэчнага тамлення, і, наадварот, у гэтым тамленні яго шмат мыслі, але песня яго знаходзілася ў цянётах змрочнага ўспрыняцця свету, над ёю цягацеў цяжкі смутак. Падтэкст яго вершаў напаўняўся туманным, замагільным настроем, паланіў яго слова і вобраз у сферу змрочных пачуццёвых станаў:



І. Эміот

Тысячы летуценняў
смуткуюць *)
Аб усім, аб усім вакол.

Эміот не мог асэнсаваць хаосу капіталістычнага свету, не знаходзіў выйсця з бясконца панаваўшага ў гэтым свеце прыгнёту і перанёс яго ў сваю творчасць як наяўныя якасці чалавечага жыцця наогул. Прыдушанае капіталістычнай сістэмай жаданне раднага і светлага жыцця імкнулася ўвасобіцца ў слова, але так і засталося ў выглядзе заблытанага ўспрыняцця свету, якое навязвала яму капіталістычная сістэма. Эміот часамі свядома ідзе з гэтай блытаніны:

Жыццё маё гэтак і будзе вісець
Нікім не згорнутым
Сцягам жалобным.

Ад часу да часу прарываліся ў яго творах словы пратэсту і горкага дакору гэтай сістэме—напрыклад, у вершах да маці, «Мой настаўнік Шымен», «Цар загадаў», «Буфет», але гэта ўсё адзінкавыя прыклады. У асноўным-жа верш яго быў пранізан смуткам і неакрэсленым тамленнем:

Без мяне ці са мной
Дні мінуцца з жалобным напевам.
Бярозы выйдуць на дарогу і будуць
шукаць
Смутак, які згубілі,
І плакаць пры гэтым.
(«Вечнае»).

Светаадчуванне Эміота было нерэальным, містычным:

Гэта ўсё невялікі прыклад, дзіця
маё,
З чагосьці далёкага, інтымнага,
вялікага:
Што сталася за дзень, усё, што
існуе
І што мы ў нашым доме маем.
(«З песень майму дзіцяці»).

Гэтыя туманныя, містычныя настроі адмоўна ўплывалі на паэтычную мову і форму твораў Эміота, таму яны часта былі расплывучатымі, неарганізаванымі.

Адсутнасць формы і беднасць мовы, уласцівую некаторым вершам Эміота, трэба прыпісаць імкненню да знешняга хараства і гарманічнасці, якія ён запазычыў з рэлігійнага светасузірання:

Кажуць: якія прыгожыя дрэвы
І вінаваты перад жыццём.

Толькі на вызваленай зямлі прасвятляецца ўнутраны свет Эміота. У першай сяброўскай усмешцы чырвонаармейца ён адчувае ўжо нараджэнне новага, светлага жыцця, свету вялікіх магчымасцей:

Свет адноўлены стаіць прад табой.
Трыццаць год жыцця як не бывала.

Усё, што ён зараз сустракае, нова для яго і здзіўляюча, усё ўзрывае яго мінулае светасузіранне:

Радасць узрастае з новымі
паняццямі,
Кожнае паняцце — вялізна.
(«Разлік»).

Замест ранейшага свету цемры і жаху Эміот бачыць свет радасці і святла:

Пераступіць цераз твой парог, —
І глядзі, як свецел, як свецел
свет.

Такімі былі першыя агульныя ўражанні ад рэчаіснасці, якія ўскалыхнулі глыбока адчуваючага Эміота і знайшлі сваё выражэнне ў радзе яго лірычных, арганічна перажытых вершаў.

Але ў Эміота адбываецца нейкі дваісты працэс. З аднаго боку, яго сувязь з новым жыццём становіцца ўсё больш канкрэтнай і поўнай, пранізанай рэальным зместам; ён пачынае бачыць радасць новага жыцця не толькі ў яе агульным, абстрактным выражэнні, але і ў канкрэтным, адзінкавым. Ён заўважае асобных выразіцеляў і арганізатараў гэтай радасці, бачыць новы тып чалавека нашай краіны —героя, стаханаўца, калгасніка, роўнапраўную працоўную жанчыну ў вершах «Сустрэчы», «Дзень новага свету», «Пяскі», «Ханайкі», «З беластоцкіх матываў», «У Кастрычніцкім поездзе», «Летні дзень» і г. д. З другога боку, да яго часта вяртаюцца сумныя карціны нядаўняга мінулага, цяжкі гнёт, пад якім знаходзіліся яўрэйскія працоўныя масы. Таму светлы настрой Эміота часта азмрочваецца і над маладой радасцю лунае ціхі смутак.

Праўда, Эміот імкнецца адагнаць цёмныя цені ўчарашняга, аблегчыць боль пакутуючых братоў радасцю свеёй краіны:

Пальцам сцерці трошку няшчасцяў—
Шчасце сцелецца па тратуару...
І што тваё адзіноцтва ў параўнанні са спевам,
Што даносіцца з вуліцы...
Кожная машына, якая прабягае міма
дзвярэй,
Радасны веснік ад цябе і к табе.

Але малюнак трагічна загінуўшай маці і тысяч іншых матак і бацькоў, што жывуць у пастаяннай нястачы і нечалавечых муках, не хоча адступіць, як гаворыць Эміот у вершы «Няшчасныя законы»:

Куды ні паеду, дзе ні буду вандроўнічаць
За мной паследуюць згорбленыя
старэчыя фігуры
Маіх бедных местачковых яўрэяў,
І мой плач будзе іх плачам.
Іх узнятыя рукі—гэта мёртвыя
крыллі,
Але яны не ўміраюць.

Альбо ў «Пісьме да маці»:

...Не можа больш твой сын хадзіць
адзінокім
Сярод акружаючай радасці, што па
дарогах цячэ.

У Эміота, які ўзнімаецца да самых глыбінь чалавечых пачуццяў, пытанне ўспрыняцця новага не з'яўляецца толькі паступовым пераходам, а перараджэннем, хваравітым і складаным:

Нялёгка пераступіць
Цераз тры дзесяткі год...
Даўно закінуты словы,
Застаўся толькі матыў.
О, як не хочацца тыя месцы
ўспамінаць,
Якія ва мне замаўчалі.
(«Судны дзень у поездзе»).

Так і адбываецца. Патроху гэтыя месцы змаўкаюць і ў цішыні пачынае нараджацца новая песня Эміота, насычаная сардэчнасцю і розумам нашага вялікага, прыгожага жыцця.

Разам з прасвятленнем зместу прасвятляецца і форма ў творчасці Эміота, дасягаючы ў такіх вершах, як «Сузіраючы Джыяконду», «Піянісіма», «У Кастрычніцкім поездзе» і г. д., поўнай цэльнасці.

Асаблівай увагі заслугоўваюць вершы Эміота аб каханні з іх пяшчотнасцю і лірызмам. У гэтых вершах яму ўдаецца выразіць танчэйшыя нюансы чалавечых перажыванняў. Глыбіня і яснасць гэтых вершаў, ціхі смутак, які лунае над імі, і непасрэдная вобразнасць, маляўнічасць робіць іх аднымі з прыгажэйшых у маладой яўрэйскай паэзіі.

Д. СФАРД.

*) Тут і ўсюды далей пераклад даецца ў падрадкоўі.

Магазін букіністычнай кнігі

Адкрыццё ў Мінску магазіна букіністычнай кнігі—даўно наспеўшая неабходнасць. Масква, Ленінград, Кіеў і іншыя буйныя гарады СССР не першы ўжо год маюць спецыяльныя магазіны, дзе можна набыць старую кнігу, памяняць яе на іншае патрэбнае выданне, заказаць літаратуру па таму пытанню, над якім працуеш.

Яшчэ А. С. Пушкін славіў вядомую кніжную краму Смірдзіна, на паліцах якой можна было знайсці не толькі навінку, але і тое, што выйшла стагоддзі назад. І калі Смірдзін перанёс свой магазін з аднаго памяшкання ў другое, свяцілы рускай літаратуры — Пушкін, Крылоў, Вяземскі наладзілі ў гонар гэтай падзеі свята і выдалі спецыяльны альманах «Новоселье».

Традыцыя гэта і дасюль жыве ў літаратурным асяроддзі. Кніжная крама Саюза савецкіх пісьменнікаў у Маскве — гэта не звычайная «гандлёвая адзінка», дзе пакупнік выпадковы, дзе яму двума-трыма словамі адказваюць: «гэта ёсць, а гэтага няма». У маскоўскім букіністычным магазіне вядзецца вялікая і патрэбная работа як з кнігай, так і з тым, хто яе купляе. І правільна: рэдкая кніга, выданая ў абмежаваным тыражы дзесяткі год назад, сама на паліцу не прыдзе. Яе трэба адшукаць, набыць.

У Мінску—па Савецкай, 86—у бліжэйшы час КОГІЗ, ідучы насустрач патрабаванням пісьменніцкай грамадскасці, адкрывае першы ў БССР спецыяльны магазін букіністычнай кнігі.

Зараз толькі пры двух кніжных магазінах у БССР—пры цэнтральным у Мінску і пры цэнтральным у Беластоку — ёсць аддзелы букіністычнай кнігі. Даволі прабыць некалькі гадзін ля прылаўка цэнтральнага магазіна КОГІЗ'а ў Мінску, дзе ляжаць рэдкія кнігі, каб мець уяўленне, якая шматлікая аўдыторыя чытачоў цікавіцца рэдкай кнігай.

Вось зайшоў студэнт. Ён просіць даць яму рэдкі дапаможнік па фізіцы, выданы некалі ў Пецярбургу. Кнігі названага аўтара не знайшлося; але студэнту прапанавалі другое выданне, не менш рэдкае і каштоўнае. Студэнт са здавальненнем бярэ яго.

Увайшоў прафесар. Ён просіць паказаць яму малавядомыя вершы Някрасава.

Пісьменнік адкладвае зборнік волжскіх песень, першае выданне твораў Бялінскага, кнігу грэчаскіх міфаў.

У букіністычным аддзеле чытач не толькі купляе кнігі, але і рэалізуе тое, што перастала быць неабходным яму ў рабоце.

Цікавы пералік унікальных кніг, набытых мінскім магазінам: «Опыт о лунатиках, сочиненный Георгием Фридрихом Мейером» (1764 год), «Коран Магомедов, часть первая» (1792 год), «Нума или процветающий Рим» (1768 год), «Геройская добродетель или жизнь Сифа, царя Египетского,—из таинственных свидетельств древнего Египта. Перевел Денис Фон Визин, издание второе» (1787 год). І далей—поўны збор усіх перакладзеных на рускую мову і надрукаваных твораў Вальтэра (1802 год), агульная і прыватная натуральная гісторыя графа дэ Бюффона (1801 год), вершы Некрасава выдання кнігапрадаўца С. Званарова (1869 год).

Гэта толькі нязначная частка таго, што набыў аддзел букіністычнай кнігі за бягучы год. Фонды яго ўзраслі да 14.000 кніг, а нядаўна ў іх ледзь налічвалася 3.000. Адсюль і зусім відавочная неабходнасць мець у Мінску, па прыкладу іншых гарадоў СССР, самастойны магазін букіністычнай кнігі.

Пачынаецца рамонт памяшкання для новаадкрываемага магазіна. Магазін будзе складацца з двух аддзелаў—аддзела закупкі і аддзела продажу. Для зручнасці пакупнікоў, у магазіне будзе ўстаноўлена вялікая кніжная вітрына, дзе чытачы будуць бачыць, што новага набыў магазін, што мае ён на сваіх паліцах.

Хацелася-б, каб адначасова з падрыхтоўкай, якая вядзецца да адкрыцця магазіна, быў прадуман і план работы з рэдкай кнігай. І тут вельмі патрэбна дапамога ССП БССР. Не лішнім будзе для пісьменнікаў узяць шэфства над магазінам і па прыкладу Масквы арганізаваць у Доме пісьменніка дзень рэдкай кнігі альбо, прасцей, кніжны рынак. Не зашкодзіць час-ад-часу вывешваць для ведама пісьменнікаў спісы набытых магазінам каштоўных выданняў. КОГІЗ мяркуе прывезці некалькі тысяч рэдкіх кніг з Масквы, але трэба мець дэтальны план закупкі рэдкай кнігі і на месцы. Студэнты, пісьменнікі, бібліятэкары, навуковыя работнікі могуць і павінны аказаць букіністычнаму магазіну дапамогу ў гэтай справе.

Адкрыццё букіністычнага магазіна—значная культурная падзея для Мінска. Трэба пажадаць КОГІЗ'у адкрыць гэты магазін як найхутчэй.

Е. САДОЎСКІ.

Творчы вечар В. Таўлая

30 мая ў беластоцкім Доме пісьменніка адбыўся вечар Валенціна Таўлая. З уступным словам аб творчасці паэта выступіў Г. Смоляр. В. Таўлай—адзін з лепшых маладых беларускіх паэтаў, творчасць якіх мела рэвалюцыйнае значэнне, адыграла значную палітычную ролю ў справе нацыянальна-вызваленчай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі.

15-гадовым юнаком В. Таўлай уступае ў комсамол, піша свае першыя вершы, поўныя гневу і нянавісці да белапольскіх акупантаў. Разам з Ф. Пестраком і М. Танкам В. Таўлай вядзе актыўную работу па згуртаванню рэвалюцыйнай пісьменніцкай моладзі, па выданню комуністычнай літаратуры. У 1933 годзе ён арганізоўвае і праводзіць у Вільні першую канферэнцыю рэвалюцыйных літаратараў. Гэта канферэнцыя вызначыла шляхі далейшай кансалідацыі творчых сіл, паклала пачатак грамадска-палітычнай і літаратурнай работы групы рэвалюцыйных пісьменнікаў, абвясціўшых рашучую барацьбу буржуазным нацыяналістам і ідэолагам «хадэцыі» (хрысціянска-дэмакратычнай інтэлігенцыі).

15-гадовым юнаком В. Таўлай трапляе ў турму. Яго абвінавачваюць у комуністычнай дзейнасці сярод моладзі. Паэт развіваецца са школай, з віленскай беларускай гімназіяй, адкуль яго выганяюць заправілы «нацыянальнай культуры», лізаўшыя боты польскіх паноў, буржуазныя нацыяналісты і здраднікі. Школай, навучаючай сапраўднаму жыццю, становіцца турма.

На вечары ў беластоцкім Доме пісьменніка В. Таўлай чытаў многія свае творы з тых сшыткаў, у якіх ён пісаў у турме не толькі вершы, але складаў канспекты па гісторыі, рашаў алгебраічныя формулы, чарціў геаметрычныя фігуры, запісваў думкі, цікавыя выразы і словы, пачутыя ад таварышоў. Паэту пашчасціла вынесці з турмы гэтыя сшыткі, але затое пасля ў вёсцы трэба было пільна захоўваць іх ад паліцыі ў падстрэшшы.

Акрамя турэмных вершаў, паэт прачытаў свае новыя творы. Асаблівае ўражанне на ўсіх прысутных зрабілі «Першамайскія сцягі» і вершы, напісаныя ў калгасе, — творы, пабудаваныя на рэальна-жыццёвых, злободзённых фактах.

Максім Танк, Пімен Панчанка, І. Эміот, Д. Сфард, Б. Марк, Наталья Арсеньева, Ц. Крысько далі высокую ацэнку прачытаным паэтам лірычным вершам і фрагментам паэм «Кобрыншчына» і «Песня пра сухара». Усе адзначалі шчырасць і глыбокую ўсхваляванасць паэзіі В. Таўлая. Унутраная стрыманасць, строгая самадысцыпліна В. Таўлая ніколі не дапускаюць у яго вершах малейшай позы, штучнага пафасу. Гэта характарызуе яго, як паэта моцнага эмацыянальнага ўздзейнічання, гранічна выразнай вобразнасці.

Многія таварышы даволі слушна папракнулі нашу крытыку, якая амаль не ведае творчасці В. Таўлая. Сход рашыў у бліжэйшы час наладзіць у Беластоку агульнагарадскі творчы вечар паэта.

В. ЦІМСКІ.

Беласток. (Наш кар.).

Актуальныя пытанні беларускай дыялекталогіі

Кола пытанняў, якія вывучаюцца дыялекталогіяй, выключна шырокае і цікавае. Гэта параўнаўча новая галіна мовазнаўства, якая даследуе жывыя народныя гаворкі, стала адной з важнейшых навук лінгвістычнага цыклу. Дыялекталогія дае каштоўнейшы, незамянімы матэрыял і для вывучэння гісторыі той ці іншай мовы, і для разумення сучаснага яе стану, і для тэарэтычных пабудоў аб прыродзе чалавечай мовы наогул. Немалаважнае значэнне мае дыялекталогія і для літаратуры, этнаграфіі, агульнай гісторыі і гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Значэнне гэтай навукі заключаецца ў тым, што яна не абмяжоўвае даследвання рамкамі пісьмовай, літаратурна апрацаванай мовы, а вывучае яе ў натуральным, так сказаць, выглядзе, як яна гучыць у вуснах шырокіх народных мас. А жывыя народныя гаворкі заўсёды характарызаваліся велізарным багаццем і разнастайнасцю гукаў, форм і сродкаў выраэння. Пры гэтым асабліва каштоўна ..., што ў розных гаворках часта захоўваюцца архаічныя элементы, адлюстроўваючыя старажытны стан мовы. Так, бе...рускія, рускія і украінскія дыялекты ...авалі ў сабе яшчэ рэшткі племянных ..., а перажыткі феадальнай эпохі сустракаюцца ў іх скрозь і ўсюды.

Гэтыя архаічныя элементы ўяўляюць ...ізарную цікавасць для гісторыі мовы. ... напрыклад, у крайніх паўночна-...ніх беларускіх і ў пераходных бела-... паўночнарускіх гаворках сустра-... замена «ц» і «ч» (курыча, ца-...) а таксама шапялявыя гукі «з», ...кія да «ж», «ш». Гэта фанетыч-... побач з іншымі данымі, дазво-...ым зрабіць вельмі важныя вы-... ...ялене ўсходнеславянскага племені крывічоў. А распаўсюджанне ў суседніх беларускіх і рускіх гаворках перажыткаў гэтага дыялекта пацвярджае агульнасць гістарычнага лёсу рускага і беларускага народаў. Наяўнасць аднолькавых тыпаў акання і якання, як і раду іншых асаблівасцей, у беларускіх і паўднёварускіх гаворках сведчыць аб супольнасці лёсу беларускага народа з другой часткай рускага народа. Распаўсюджанне дыфтонгаў «уо» і «іе» (куонь, ліес) у паўднёвабеларускіх і паўночнаукраінскіх гаворках з'яўляецца пераканальным сведчаннем блізасці, родства адпаведных дыялектаў і, вядома, іх носьбітаў; толькі па адной гэтай асаблівасці, не гаворачы аб многіх іншых, устанаўліваецца ўжо блізасць беларускага і украінскага народаў.

З другога боку, дакладны аналіз дзекання і цекання, характару гука «р» і іншых рыс у беларускіх гаворках даў магчымасць абвергнуць няправільныя сцвярджэнні некаторых вучоных аб нібыта ляшскім паходжанні беларусаў альбо моцным уплыве на іх польскіх элементаў.

Можна было-б прывесці яшчэ шмат прыкладаў падобнага роду.

Велізарная роля дыялекталогіі для навукі была па дастоінству ацэнена вялікім спадвіжнікам Маркса—Энгельсам. У сваёй барацьбе з фармалізмам буржуазнай лінгвістыкі ён звярнуўся імена да дыялектаў, да жывых народных гаворак. І яго выдатная работа «Франкскі дыялект» дала яму магчымасць паставіць і бліскуча вырашыць рад новых важных пытанняў мовазнаўства і гісторыі.

Не меншае значэнне мае дыялекталогія і для літаратуры, для літаратурнай мовы. Развіццё, удасканаленне, узбагачэнне літаратурнай мовы ідзе, галоўным чынам, па лініі выкарыстання і апрацоўкі багаццяў народнай мовы, народных гаворак. Народ з'яўляецца тварцом мовы, якая ў творах выдатных пісьменнікаў атрымлівае ўжо адпаведную літаратурную апрацоўку. Глыбокае знаёмства з народнымі гаворкамі, дасканалае веданне тэрытарыяльных і сацыяльных дыялектаў для пісьменніка ўдвая неабходна. Аб гэтым сведчыць дзейнасць лепшых пісьменнікаў ад Пушкіна і Гогаля да Горкага і Шолахава.

Элементы народнай мовы ў творах класікаў нашай літаратуры выкарыстаны не толькі ў гаворцы персанажаў, у якасці адной з самых яркіх рыс характарыстыкі таго ці іншага вобраза, але, умела апрацаваныя і ўдала ўжытыя, увайшлі і ў аўтарскую мову, сталі неад'емным здабыткам агульнанацыянальнай літаратурнай мовы. Прыпомнім, што Пушкін заклікаў пісьменнікаў вучыцца рускай мове ў народа. Прыпомнім, наколькі тонка і ўмела характарызуе Гогаль вобразы сваіх Іванаў, дам горада N («Мёртвыя душы»), Наздрова, Каробачкі тым, што адлюстроўвае ў іх мове тэрытарыяльныя, сацыяльныя і нават прафесіянальныя дыялекты. Прыпомнім, як майстэрска выкарыстоўвалі дыялектызмы Талстой і Горкі. Спашлёмся, нарэшце, на майстэрскае ўжыванне элементаў народнай мовы ў выдатных кнігах Шолахава.

Толькі дыялектызмамі трэба карыстацца ўмела, асцярожна і пры ўмове дасканалага ведання народных гаворак. У супраціўным выпадку мова можа стаць незразумелай і ўродлівай. На гэта ўказваў і А. М. Горкі, прыводзячы ў якасць прыкладу «Брускі» Панфёрава.

Але ў нас часам з боку некаторых таварышоў прыкметны залішне ўжо асцярожныя адносіны да багаццяў беларускіх народных гаворак, асабліва да багаццяў лексічных. Між тым, смелае і далёка ідучае выкарыстанне славеснага і фразеалагічнага дыялектнага матэрыялу з'яўляецца неабходнейшай умовай пасяховага развіцця беларускай літаратурнай мовы. Гэта выцякае з таго, што наша літаратурная мова яшчэ вельмі маладая, яна, можна сказаць, знаходзіцца яшчэ ў стадыі фарміравання. Крыніцай яе ўзбагачэння павінна служыць у першую чаргу мова народа. Асэнсаванае, разумнае выкарыстанне гэтай невычарпальнай крыніцы безумоўна ўзбагаціць мову нашай літаратуры, надасць ёй тую сакавітасць, яркасць, выразнасць і чоткасць, якіх дасягнула ўжо руская літаратурная мова.

Вядома, што ўзбагачэнне нашай літаратурнай мовы ідзе і будзе ісці таксама і па другіх лініях, у прыватнасці, па лініі выкарыстання багацейшай скарбніцы блізкіх і родственых ёй рускай і украінскай моў, як і іншых. Але асноўны, генеральны шлях развіцця беларускай літаратурнай мовы — гэта ўсямернае выкарыстанне і апрацоўка ўсяго каштоўнага, яркага і выразнага, што ёсць і чым багаты нашы народныя гаворкі.

Можна з упэўненасцю сказаць, што зараз развіццё беларускай літаратурнай мовы пойдзе значна шпарчэй, інтэнсіўней, чым да апошніх год. І не толькі таму, што яна дасягнула ўжо даволі высокага ўзроўню. Але і таму, што амаль палова беларускага народа, раней прыгнятаемая польскімі панамі, адарваная і ізаліраваная ад бурна развіваючайся беларускай соцыялістычнай культуры, з 1939 года з'ядналася са сваімі ўсходнімі братамі па крыві, і няма сумнення, што яна ўнясе сваю багатую долю ў справу развіцця роднай літаратурнай мовы.

Для таго, каб як след выкарыстаць скарбніцу народнай мовы, трэба ведаць яе, з дня ў дзень вывучаць — глыбока, удумліва, сур'ёзна, на падставе навейшых дасягненняў мовазнаўства. А для гэтага трэба ўзняць на адпаведную вышыню дыялекталогію, забяспечыць яе кваліфіцыраванымі спецыялістамі, стварыць усе ўмовы для яе росквіту.

На вялікі жаль, гэта важнейшая навука, якая можа прынесці неацанімую карысць развіццю беларускай культуры, знаходзіцца ў далёка не здавальняючым стане. На самой справе, за апошнія 10—15 год не выдана (і не напісана) ніводнай мала-мальска сур'ёзнай працы, ні адной манаграфіі па беларускай дыялекталогіі. На літаратурных факультэтах педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў, на філалагічным факультэце Дзяржаўнага беларускага універсітэта гэта дысцыпліна нават не чытаецца. Няма не толькі падручніка, але хоць-бы якога-небудзь дапаможніка па беларускай дыялекталогіі. Аб занядбанасці гэтай галіны беларускага мовазнаўства сведчыць і тое, што ў рэспубліцы не рыхтуюцца навуковыя работнікі-дыялектолагі; з рыхтуючыхся зараз 15 аспірантаў-мовазнаўцаў толькі адзін спецыялізіруецца па беларускай дыялекталогіі.

Між тым, у братніх рэспубліках курс дыялекталогіі на літфаках з'яўляецца абавязковым і там вядзецца такая капітальная праца, як складанне дыялекталагічных атласаў, выдаюцца манаграфіі і г. д.

Акадэмія навук БССР за апошнія годы два таксама стала рабіць што-ні-што ў галіне дыялекталогіі. У прыватнасці, вядзецца работа па вывучэнню гаворак заходніх абласцей рэспублікі. Экспедыцыі, пасланыя туды, прывезлі вельмі каштоўны ў многіх адносінах матэрыял. Але гэта толькі пачатак велізарнай работы, якую трэба разгарнуць ва ўсю шырыню. Работа-ж гэта не будзе праароблена да таго часу, пакуль дыялекталогіяй будзе займацца ў акадэміі толькі невялічкая група асоб, пакуль універсітэт, педагагічныя і настаўніцкія інстытуты будуць стаяць у баку ад гэтай справы ці працаваць без агульнага плана і адзінага навуковага кіраўніцтва.

Трэба стварыць усе ўмовы для развіцця беларускай дыялекталогіі. Становішчам гэтай навукі павінны больш зацікавіцца кіруючыя органы, Акадэмія навук, Наркамасветы, пісьменніцкая грамадскасць.

На нашу думку, неабходна безадкладна правесці наступныя мерапрыемствы:

На філалагічным факультэце універсітэта, на літаратурных факультэтах педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў (дзённых і вячэрніх, завочных), на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў-філолагаў у абавязковым парадку ўвесці курс беларускай дыялекталогіі ў аб'ёме 30—60 гадзін.

Кафедры мовы вышэйшых навучальных устаноў павінны ўключыцца ў работу па вывучэнню беларускіх гаворак, прыцягваючы да гэтай справы студэнтаў, праводзіць дыялекталагічныя экспедыцыі.

Трэба прыступіць да стварэння падручніка беларускай дыялекталогіі для ВНУ.

Тры-чатыры аспіранты-мовазнаўцы І і ІІ гадоў навучання павінны спецыялізіравацца па беларускай дыялекталогіі і ў якасці дысертацый прадставіць даследванні народных гаворак.

Гэтыя мерапрыемствы забяспечаць падрыхтоўку кадраў спецыялістаў-дыялектолагаў і актыва, на які змогуць апірацца ў сваёй рабоце навукова-даследчыя ўстановы.

Створаная ўжо пры Акадэміі навук камісія павінна прыступіць да разгортвання работы па складанню атласа беларускай мовы, выкарыстоўваючы для гэтага ўсе філалагічныя сілы рэспублікі і ўзначаліўшы ўсю работу па дыялекталогіі. У першую чаргу неабходна падрыхтаваць і выдаць дакладны і падрабязны пытальнік па вывучэнню беларускіх гаворак розных месц.

Нам здаецца, што і пісьменнікі могуць аказаць вялікую дапамогу навуковым установам сваімі назіраннямі над народнай мовай.

Час, нарэшце, агульнымі намаганнямі ўзяцца за ўзняцце беларускай дыялекталогіі, каб паставіць гэту навуку на такі ўзровень, якога яна па-праву заслугоўвае.

К. ГУРСК—
А. ТУРЭЦКІ 394



Сцэна спектакля «Багдап Хмяльніцкі» Карнейчука. Засл. артыст УССР **І. Маяк** (злева) у ролі Багдана Хмяльніцкага і артыст **М. Хораш** у ролі Крываноса.

Фота І. Каплінскага.

Гераічная старонка гісторыі

«Багдан Хмяльніцкі» у Одэскім тэатры рэвалюцыі

Одэскі тэатр рэволюцыі знаёмы гледачу сталіцы Совецкай Беларусі па гастролях мінулых год. І вось адбылася новая, даўно чаканая, сустрэча.

Спектаклем «Багдан Хмяльніцкі» 3 чэрвеня пачаў сваю работу ў Мінску Одэскі тэатр. Гэта п'еса лаурэата Сталінскай прэміі А. Карнейчука разгортвае перад гледачом гераічную старонку гісторыі украінскага народа — эпізоды барацьбы народа пад водзіцельствам Багдана Хмяльніцкага за сваё вызваленне з-пад іга польскіх паноў у XVII стагоддзі. Хвалюючы малюнак барацьбы украінскага народа ўваскрашае ў памяці беларускага гледача гераічнае мінулае свайго народа — яго барацьбу супроць сваіх адвечных ворагаў — польскіх паноў. Гэты таленавіты твор выхоўвае ў гледача высокія патрыятычныя пачуцці.

Цікавы спектакль стварыў зладжаны калектыў Одэскага тэатра. Мастацкі кіраўнік тэатра, пастаноўшчык спектакля народны артыст УССР В. Васілька, выразна раскрыў ідэю, вобразы твора.

У цэнтры падзей — адданы народу, афяруючы ўсім асабістым для перамогі над ворагам, для вызвалення свайго народа—гетман Багдан Хмяльніцкі. Гэта цэльная натура, мужны характар. Так трактуе гэты вобраз засл. артыст УССР І. Маяк. Гэта правільна, добра. Але актору можна пажадаць далейшых пошукаў у раскрыцці вобраза, — надання яму яшчэ большай унутранай сілы, страснасці—рыс, уласцівых баявому кіраўніку народных мас.

Максім Крыванос, сялянскі атаман, бліжэйшы друг і паплечнік Хмяльніцкага,—мудры і мужны чалавек. Ён—бясстрашны ў баі, слаўны палкаводзец узброенай косамі і драколлем паўстаўшай беднаты. Ён гарыць найвялікшай нянавісцю да паноў, свяшчэннай нянавісцю свайго народа. Ярка, дасканала створан гэты вобраз артыстам М. Хорашам. І дасціпнае, выдатнае раскрыццё вобраза Крываноса ў значнай меры абумоўлівае поспех усяго спектакля. Актор роўна і з вялікім пачуццём вядзе сваю ролю. У кожнай сцэне ён знаходзіць новыя рысы для раскрыцця характару волевага, мэтанакіраванага, непрымірымага да ворагаў, разумнага і своеасабліва лірычнага кіраўніка паўстанцаў-сялян — Максіма Крываноса. З вялікім уздымам іграе М. Хораш гэту ўдзячную ролю.

Менш яркіх фарбаў даў драматург другому паплечніку Хмяльніцкага—Багуну. Але актор Я. Возіян выкарыстаў усе магчымасці ролі і стварыў вобраз, які хвалюе і запамінаецца. Асабліва добра вядзе сваю ролю актор у сцэнах суда над Багуном—суда, які адбыўся ў выніку паклёпу здрадніка Лізагуба.

Пісар Лізагуб—дробная душа, подлы здраднік,—устае перад гледачом у выкананні артыста З. Кашачэўскага ва ўсім сваім агідным аблічы. Дарма толькі крыху затушоўвае актор сутнасць гэтага персанажа ў пачатку. Узмацненне паказу каварства гэтага ворага можа даць яшчэ большае напружанне спектаклю. Але і створаны аўтарам вобраз—пераканаўчы.

Стары запарожац Тур у выкананні артыста І. Васільева кранае гледача. Гэта—скромны і мужны сын народа, афяруючы сваім жыццём у імя перамогі. Застаецца ў памяці маляўнічы вобраз Івана Доўбні (арт. М. Багданаў), вобраз яго бацькі—старога казака Шайтана (арт. П. Кісялевіч). Менш выразна распрацаваны астатнія вобразы запарожцаў і сялян. А дарма! Яскравасць, характэрнасць кожнага персанажа, нават удзельніка масавай сцэны, узмацняе спектакль, надае яму большую сілу ўздзеяння. І гэтага трэба дабівацца.

Шмат цікавага знайшоў у ролі дзяка Гаўрылы артыст І. Твердахлеб. Гэта надзвычай характэрны, своеасаблівы персанаж. Пад вопраткай дзяка б'ецца сэрца воіна, сэрца мужнага паўстанца. Разумны і знаходлівы, жвавы і вясёлы,—ён сапраўдны любімец запарожцаў. Такім і трактуе Гаўрылу актор. Але часам з'яўляюцца ў акторскім выкананні залішне шаржыраваныя штрыхі, якія зніжаюць абаянне гэтага каларытнага персанажа —вялікай удачы драматурга.

Праўдзіва, шчыра іграе засл. артыстка УССР Г. Мяшчэрская ролю ўдавы Варвары. Яна стварыла суровы і кранальны вобраз шмат пакутваўшай, але не зломленай жыццём жанчыны, чулай і мужнай. Добра вядзе ролю Саламеі, унучкі Варвары, артыстка Н. Вашчэнка. Толькі артыстцы варта надаць свайму персанажу больш гарэзнасці, агністых рыс маладосці. Цікава і Б. Міхалевіч у ролі шляхцянкі Зосі, каварна падасланай у стан Хмяльніцкага.

Трапна дадзена галерэя паслоў, прыбыўшых да Хмяльніцкага. З гэтых персанажаў вылучаюцца князь Чацвярцінскі (арт. Б. Чэрноў), рускія паслы (артысты В. Бартко, А. Спідлен).

У выкананні асобных ролей ёсць хібы, недасканаласці. Але ўвогуле спектакль —значны мастацкі твор, які раскрывае выдатную карціну дружбы, братняй еднасці украінскага і рускага народаў, вызваленчай барацьбы украінскага народа супроць сваіх прыгнятальнікаў — польскіх паноў.

Спектакль глыбока хвалюе драматычнасцю падзей, захапляе шчырасцю і яскравасцю раскрыцця адной з гераічных дат у гісторыі народаў нашай радзімы, праўдзівасцю створаных вобразаў народных герояў. Патрыятычны спектакль паказаў нашаму гледачу Одэскі тэатр.

У гастрольным рэпертуары тэатра—рад новых спектакляў: сучасная драматургія, класіка: украінская, руская, заходнееўрапейская. Шмат цікавага для мінскага гледача — наперадзе.

Віншуючы Одэскі тэатр рэволюцыі з поспехам паказу свайго першага спектакля, пажадаем яму новых творчых перамог у стварэнні таленавітых, натхняючых гледача спектакляў.

Ю. РУДЗЬКО.

У Пінскім тэатры

Пінскі абласны драматычны тэатр завяршае сваю гастрольную паездку. Ён быў у Барысаве, Магілеве, Мазыры, а зараз працуе ў Рослаўлі (Смаленская вобласць). За час гастролей тэатр падрыхтаваў спектаклі «Няроўны шлюб» бр. Тур, «Машанька» А. Афінагенава. У сучасны момант тэатр разгортвае работу па падрыхтоўцы двух новых спектакляў—пастаноўкі п'есы «Разлом» Б. Лаўранёва і камедыі «Свае людзі» І. Гурскага. У плане далейшай работы — пастаноўка п'ес «Несцерка» В. Вольскага і «Бязбацькавічы» П. Данілава (гэта п'еса была адзначана журы рэспубліканскага туру Усесаюзнага конкурса на лепшую п'есу).

У канцы чэрвеня тэатр вяртаецца ў сваю вобласць. Тэатр мяркуе разгарнуць вялікую работу па абслугоўванню калгаснікаў Піншчыны, працуючых па асушцы балот. На меліярацыйных участках тэатр будзе паказваць свае спектаклі і спецыяльна падрыхтаваны канцэрт.

Г.

„ПОМСТА" А. ФРЭДРЫ

Спектакль Дзяржаўнага Польскага тэатра БССР

Невыпадкова творы старога камедыёграфа А. Фрэдры, «польскага Мальера», уключаны ў рэпертуар Дзяржаўнага Польскага тэатра БССР. Ніхто ў польскай літаратуры не раскрыў так сваё асяроддзе, з такой халоднакроўнай абыякавасцю, як гэта зрабіў граф Фрэдра. Быў ён свежаспечаным арыстакратам: бацька яго купіў адзін з тых графскіх гербаў, якія аўстрыйскі цэзар шчодра (і за шчодрыя грошы) прадаваў польскай шляхце.

Граф Фрэдра, не гледзячы на падзел Польшчы, бачыў свет праз ружовыя акуляры і нават не думаў іграць у прапаведніка і маралізатара. Заняпад шляхецкай Польшчы, распад дзяржавы, усё гэта не кранала новага арыстакрата. Ён дасканала прыстасаваўся да новай сітуацыі і ахвотна прыпаў да трона новага «найяснейшага». Польская арыстакратыя прагнула мець хоць якога цэзара, абы ён гарантыраваў яе прывілегіі і бараніў яе ад рэволюцыі.

Вось чаму камедыя Фрэдры, у процілегласць класічным камедыям, не мае прагрэсіўных рыс. Фрэдра не хацеў грамiць, забіваць смехам. Фрэдра пiша для забавы. Ён зусім не хоча быць рэфарматарам, не хоча нічога выпраўляць, ратаваць. Для яго ўсё ў парадку. Ён проста, з панскай фантазіі, рысуе забаўныя вобразы з блізкага і мілага яму асяроддзя. Не дзіва, што Фрэдра меў працiўнікаў у тагочасных дэмакратычных колах Польшчы і, «абражаны» імі, зусім кінуў пяро драматурга.

Хоць Фрэдра і не ішоў на чале прагрэсіўнага руху, аднак, яго камедыі вельмі яскрава паказваюць тагочаснае грамадства. Вобразы шляхцічаў, уланаў, дам і інш., якія Фрэдра рысуе спагадным пяром, уяўляюцца нам як вобразы дурняў, гультаёў, людзей з проста падазронымі этычнымі прынцыпамі. Насуперак намерам аўтара, які хацеў толькі забаўляць, грамадства ў яго камедыях паказана ва ўсёй аб'ектыўнай праўдзе і нагаце.

«Помста» належыць да лепшых твораў Фрэдры. Праўда, у ёй ёсць не адна непраўдападобнасць, але Фрэдра часта дазваляў сабе гэта,—ён быў бліжэй да фарсу, які не вельмі дбае аб логіцы. Фрэдра клапоціцца больш аб стварэнні камічных сітуацый і яркіх тыпаў. І ў «Помсце» ён даў выдатныя тыпы Чэсніка, натарыуса Мільчэка і Папкіна.

Чэснік і натарыус — два шляхцічы, якія займаюць дзве паловы аднаго і таго-ж замка, ведучы між сабою няспынную вайну, нескапчоныя судовыя працэсы. На граніцы іх уладанняў стаіць поўразваленая сцяна, якую натарыус хоча направіць. Натарыус хоча—гэта дастатковы повад для таго, каб Чэснік не хацеў. Ён загадвае сваім людзям прагнаць муляроў, а натарыус скарыстоўвае гэта для новага працэсу.

Натарыус Мільчэк з'яўляецца процістаўленнем Чэсніка — ён скрытны, маўклівы. Ён нізка кланяецца ўсім, але паціху рыхтуе розныя шкоды. Ён верыць больш у хітрыкі і падкопы, чым у сілу. Гэта двудушнік, які ходзіць з імем бога на вуснах.

У натарыуса ёсць сын, Вацлаў, а ў Чэсніка—маладзенькая і наіўная пляменніца, Клара. Яны ўпотай кахаюць адзін другога, ім перашкаджае антаганізм старых. Чэснік і Мільчэк думаюць толькі аб сваіх разрахунках і помсце. Мільчэк афяруе шчасцем сына, прытворна цалуючы яго ў лоб і ўзнімаючы вочы да неба, а Чэснік шалёнымі ад злосці вачыма не бачыць нікога, апрача натарыуса. Патраціўшыся на працэсы, Чэснік збіраецца ажаніцца з багатай Падсталінай, тройчы ўдавой, якая жыве ў яго замку. Гэту справу ён даручае ўладзіць свайму чалавеку, майстру «на ўсе рукі» Папкіну. Папкін—тып пашыранага ў тагочаснай Польшчы збяднелага шляхціча —прыжывальшчык у багацея, які за аб'едкі са стала гаспадара выконвае розныя яго даручэнні. Папкін, балбатлівы самахвал, з замілаваннем расказвае аб сваіх геройскіх учынках — ваенных і любоўных, а ў сапраўднасці ён —трус і хвальбо, які ўвесь час трапляе ў забаўныя сітуацыі. Калі Чэснік накіроўвае Папкіна да натарыуса з даручэннем выклікаць яго на паядынак, Папкін, узброены ад ног да галавы, ледзь не памірае са страху. З'явіўшыся да напышлівага і ветлівага натарыуса, Папкін заразжа ператвараецца ў рыклівага льва і з бахвальствам гаворыць натарыусу аб мэце свайго прыходу. Калі-ж натарыус ціха і ўнушальна гаворыць, што скіне яго з лесвіцы, Папкін адразу робіцца мяккім і лагодным, як ягнё, хоць гэта і не выратоўвае яго ад скідвання з лесвіцы.

Натарыус, каб назлiць Чэсніку, вырашыў забраць у яго з-пад носу багатую Падсталіну і ажаніць з ёю свайго сына Вацлава. Падсталіна ахвотна згаджаецца памяняць Чэсніка на маладога Вацлава. Вацлаў у роспачы: яго шлюб з Кларай разбіваецца з-за камбінацый бацькі.

Чэснік, даведаўшыся аб хітрым манеўры натарыуса, надумаў страшэнную помсту: ён пераманьвае ў свой дом Вацлава і пагражае кінуць яго ў турму, калі ён не ажэніцца з Кларай. Вацлаў з радасцю згаджаецца на гэты доўгачаканы «прымус». Адбываецца шлюб. У гэты момант у доме Чэсніка паяўляецца натарыус. Маладая пара просіць яго благаславення. Натарыус стаіць перад фактам і, ведаючы, што Клара прынясе з сабою вялікае багацце, гаворыць сваё «няхай будзе воля неба» і благаслаўляе маладых. Настае «шчаслівы канец»: абодва шляхцічы падаюць адзін другому рукі. Аднак, глядач не ўзрушан гэтай сцэнай: дазвол Чэсніка на шлюб маладых — вынік не яго дабраты, а помсты. І ў натарыуса гэта — справа разрахунку і сіла факта, які адбыўся.



Сцэны спектакля «Помста» Фрэдры. Злева — арт. **М. Гадлеўскі** ў ролі Мільчэка і арт. **Т. Райкоўскі** ў ролі Дындальскага; справа — арт. **Я. Вашчэровіч** у ролі Папкіна і арт. **С. Брылінскі** ў ролі Чэсніка. Фота І. Каплінскага.

Такі змест п'есы. Вядома, трэба ўбачыць сцэну дыктавання Чэснікам старому слугу любоўнага пісьма, сцэну размовы Папкіна з натарыусам, альбо з Кларай, каб ацаніць вялікае пачуццё камізму «польскага Мальера».

Выдатная фігура Папкіна, праўда, не арыгінальная. Яна мае традыцыю ў класічных камедыях. Фрэдра ўзяў гэты вобраз рыцара-балбатуна з вядомай п'есы рымскага камедыёграфа Плаўта «Салдат-самахвал». Але Фрэдра ўзбагаціў яго новымі рысамі і так па-майстэрску напісаў сцэны з Папкіным, што нельга гаварыць аб простым наследванні. Рысуючы гэты вобраз, Фрэдра выявіў вялікае майстэрства назіральніка.

Натарыус і Чэснік з'яўляюцца для гледача добрай ілюстрацыяй таго, чаму распалася шляхецкая Польшча. Не магла яна існаваць пры такіх заўзятых сутяжніках, для якіх не існавала нічога, апрача ўласнага двара і сметніка. Фрэдра не думаў рабіць якіх-небудзь вывадаў. Аднак, незалежна ад яго жадання, ён стварыў выдатныя вобразы шляхецкага свету: сутяжнікаў, ліхвяроў, гандлюючых каханнем і «гонарам».

«Помста» поўна руху і жыцця, ні адна сцэна ў ёй не з'яўляецца зацягнутай, гучны верш Фрэдры плыве шпаркім струменем.

Акторы Брылінскі і Гадлеўскі з поспехам увасобілі два процілеглых тыпы шляхцічаў — Чэсніка і натарыуса. Гледача ўвесь час цешыў выдатны актор Вашчэровіч у ролі Папкіна. Петрашкевіч быў сімпатычным, крыху нясмелым Вацлавам. Герсон была, можа, залішне арыстакратычнай, але цалкам яшчэ «вартай грэху» Падсталінай. Вобраз маладзенькай Клары, на шляху кахання якой стаялі перашкоды, абаяльна стварыла маладая акторка Міхальская.

Спектакль з'яўляецца ўдалым дэбютам маладога рэжысёра А. Юно. Пад кіраваннем Аляксандра Венгеркі гэта ўжо другі ўдалы рэжысёрскі дэбют (першым была «Панна Малічэўская», пастаўленая рэжысёрам Леоніяй Яблон). Гэта сведчыць аб творчым росце маладых рэжысёраў Польскага тэатра БССР.

Варта ўсё-ж адзначыць, што ў трактоўцы «Помсты» рэжысура пайшла па старому, пратаптанаму шляху стварэння **толькі** вясёлага спектакля і недастаткова завастрыла сатырычныя элементы камедыі, а гэта, апошняе, надало-б спектаклю большую значымасць.

Альфрэд ДЭГАЛЬ.

Выстаўка творчасці А. Бразэра і Л. Лейтмана

2 чэрвеня ў мінскім Доме мастака адкрылася выстаўка работ двух мастакоў: заслужанага дзеяча мастацтваў БССР А. М. Бразэра і акварэліста Л. М. Лейтмана. На выстаўцы прадстаўлены 110 работ у рысунках акварэлях, гуашы.

На адкрыцці выстаўкі прысутнічала звыш 200 чалавек: мастакі, кампазітары, артысты. Адкрыў выстаўку адказны сакратар Саюза совецкіх мастакоў БССР Е. А. Зайцаў. Цікавы даклад аб творчасці прадстаўленых на выстаўцы таварышоў зрабіў начальнік ізоаддзела Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР Д. П. Генін.

— Гэта выстаўка па ліку 15-я ў гэтым годзе па БССР. Такога размаху паказу творчасці мастакоў наша рэспубліка дасюль не ведала. Даволі прыгадаць, што за ўвесь 1940 год па рэспубліцы было арганізавана 12 выставак, — гаворыць тав. Генін. — Выстаўка нашых старэйшых мастакоў тт. Бразэра і Лейтмана — гэта кавалак гісторыі развіцця выяўленчага мастацтва ў Беларусі. Не гледзячы на розніцу ў манеры работы, абодвух іх еднае ўменне скупымі сродкамі адлюстроўваць тыпізіраваныя вобразы людзей, жывапісныя куткі нашай радзімы. У гэтым сэнсе выстаўка тт. Бразэра і Лейтмана ўяўляе сабою незвычайную з'яву ў мастацкім жыцці БССР.

З цікавасцю разглядаюць гледачы скульптурныя работы Бразэра: бюст народнага артыста СССР Міхоэлса (1934 год), статуэтку «Сталін» (1941 год). З работ Бразэра ў жывапісу, графіцы звяртаюць на сябе ўвагу добра выпрацаваны ў колеры «Аўтапартрэт», рысунак атрамантам «Галава яўрэя», два зробленых тушшу пейзажы «Віцебск», накід алоўкам «Поп». З работ апошніх год выклікае захапленне зроблены ў сангіне партрэт дачкі мастака.

Работы тав. Лейтмана прысвечаны пераважна яго роднаму гораду Віцебску. Прыкоўваюць увагу тонка выкананыя ў гуашы пейзажы «Вясна», «Млын на Віцьбе», «Спякотны дзень», тры рысункі на індустрыяльныя тэмы (панчошная фабрыка «Кім») і работы на абаронныя тэмы: «Палітгадзіна» і «Вячэрні дазор».

Вялікай удачай аўтара з'яўляецца зроблены ім у 1941 годзе партрэт «Дзяўчына ў блакітным» (акварэль і гуаш). У ім дадзены лірычны вобраз сучаснай дзяўчыны. Гэта рэч з'яўляецца аздобай выстаўкі.

Выстаўка тт. Бразэра і Лейтмана ў папоўненым выглядзе ў першых чыслах ліпеня будзе накіравана ў Кіеў для паказу працоўным братняй Украінскай ССР.

І. Р.

Музей выяўленчага мастацтва ў Беластоку

Днямі ў Беластоку адкрыецца музей выяўленчага мастацтва. Гэта — вялікая падзея ў культурным жыцці вобласці. Варта ўспомніць, што пры ўладараванні польскіх паноў на тэрыторыі ўсёй Заходняй Беларусі не было ні аднаго музея.

Творы мастацтваў былі ўласнасцю князёў, графаў і магнатаў. Совецкая ўлада вярнула народу выдатнейшыя творы вялікіх майстроў, зрабіла іх здабыткам усіх працоўных.

Музей набыў рад рэдкіх твораў лепшых рускіх жывапісцаў, карцін, якія ўяўляюць вялікую мастацкую каштоўнасць. Сярод іх яшчэ невядомы партрэт работы Рэпіна, эцюд Левітана—лясны пейзаж, ранняя карціна на біблейскія тэмы Сурыкава, якая дацiравана 1873 годам і адносіцца да перыяду вучобы мастака ў Акадэміі, эскіз да карціны «Завіруха» Перова, малюнак Айвазоўскага «Від на Басфор».

З вядомых польскіх мастакоў музей мае надзвычайнай цікавасці карціну В. Ваньковіча «Адам Міцкевіч у Крыме на гары Аю-Даг» (1828 год), бронзавую скульптуру «Гладыятар» Валеньскага (1881 год), работы І. Хэлмоньскага і інш.

Асобны раздзел музей адводзіць старажытнаму і сярэдневяковаму часу. Тут заслугоўваюць увагі бронзавы посуд для малака, зроблены ў першым стагоддзі нашай эры ў Пампеі, разьба па слановай касці нідэрландскага майстра, «Партрэт» работы вучня Леанарда да-Вінчы—Джыампетрына.

Музей сабраў значную калекцыю фарфаравай і фаянсавай пасуды, сярэбранай і залатой чаканкі і мноства мастацкіх тканін: коўдраў, ручнікоў, настольнікаў, паясоў—лепшых узораў народнага ткацкага майстэрства.

Асноўнае месца ў музеі займае раздзел совецкага мастацтва—жывапісу, графікі і скульптуры. У ім будуць прадстаўлены лепшыя мастакі Масквы, Ленінграда, Мінска і Беластока. Атрыманы ўжо творы лаурэатаў Сталінскай прэміі І. Грабара і А. Герасімава, заслужаных дзеячоў мастацтваў БССР Азгура і Бразэра, карціны беластоцкіх мастакоў Ляндау, Тыбера і інш.

Н. К.

Беласток.

Спаборніцтва паміж мастакамі Беластока і Львова

На сваім апошнім сходзе, у якім прынялі ўдзел прыехаўшыя з Мінска старшыня аргкамітэта Саюза мастакоў БССР тав. Рубінштэйн, начальнік ізоаддзела Упраўлення на справах мастацтваў тав. Генін і мастак-ордэнаносец тав. Пашкевіч, мастакі Беластока выклікалі на социялістычнае спаборніцтва мастакоў Львова.

Асноўная мэта спаборніцтва—лепшая падрыхтоўка да выстаўкі «Наша радзіма», сустрэча 25-годдзя Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі творамі, дастойнымі ўсенароднага свята.

Беласток. **(Наш кар.).**



Удзельніцы спектакля «Казкі Гофмана» Оффенбаха. Злева направа: нар. артыстка БССР **Р. Млодэк** — Антонія, салістка **Р. Крыцці** — Джульета і засл. артыстка БССР **Л. Аляксеева** — Олімпія.

Фота І. Каплінскага.

„Казкі Гофмана"

Прэм'ера ў Дзяржаўным ордэна Леніна тэатры оперы і балета БССР

Сезон 1940—1941 года ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР завяршае пастаноўка оперы «Казкі Гофмана». Опера гэта належыць пяру творца парыжскай класічнай аперэты Ж. Оффенбаха і займае асобнае месца ва ўсёй музычнай творчасці апошняга.

«Казкі Гофмана», бадай, адзіная опера, у якой фантастычны элемент паказан з такой выразнасцю, што часам цяжка знайсці граніцу між рэчаіснасцю і вымыслам. Гэта рыса надзвычай характэрна і для твораў буйнейшага нямецкага пісьменніка, кампазітара і юрыста канца XVIII і пачатку XIX стагоддзя Э. Гофмана, чыя фігура пастаўлена ў якасці загалоўнага персанажа оперы. Самы змест «Казак Гофмана» з'яўляецца камбінацыяй апавяданняў Гофмана, пранізаных надзвычайнай паэзіяй, напоўненых дзівоснымі вобразамі, нябачанымі цудамі, здзіўляючымі з'явамі. З іх перад намі ўстае абаяльная асоба паэта-рамантыка.

Інтрыга оперы «Казкі Гофмана» не мае цэльнасці. Кожны эпізод яе існуе самастойна, будучы звязан адзін з другім толькі агульнай мысляю—канфліктам мастака-паэта з праследуючым яго злым фатумам эпохі, увасобленым у вобразе дарадцы Ліндорфа.

У пастаноўцы оперы (рэжысёр О. Барысевіч, рэжысёр-асістэнт Д. Румянцаў) відаць імкненне наблізіць спектакль да свету гофманаўскай рамантыкі. Ужо адна гэта акалічнасць робіць пастаноўку цікавай. Да ліку станоўчых бакоў спектакля трэба аднесці і тое, што фантастычны элемент у ім раскрыт не ў чыстай сваёй форме, а як вынік выбражэння герояў. Адсюль нават яўна нерэальныя сцэнічныя палажэнні набываюць асобую значымасць і сэнс, ярка раскрываюць сучасную Гофману эпоху. Адчуваецца, што і з выканаўцамі была праведзена вялікая і сур'ёзная работа.

Другая пастаноўка О. Барысевіч за прайшоўшы сезон (першай была опера «Трыльбі») зроблена добра і з густам.

Добра справіўся са сваёй задачай аркестр. Дырыжору, заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР Н. Грубіну, правільнай трактоўкай музыкальнай спецыфікі Оффенбаха ўдалося дасягнуць поўнацэннага, шматфарбнага гучання аркестра.

Хочацца адзначыць і дасканалае выкананне харавых партый (хармейстар А. Бельскі). Можна ўстанавіць бясспрэчны рост усяго харавога калектыва, які, як відаць, знаходзіцца ў перыядзе плодатворных творчых дзярзанняў. Экспрэсіўна гучыць мужчынскі хор у пралогу і эпілогу. Харавы калектыў тэатра бясспрэчна моцны.

Цэнтральную партыю оперы—Гофмана выконвае заслужаны артыст БССР В. Лапін. Як вакалісту, яму ўдалося дасягнуць значнай эфектыўнасці, але акторска яму, на нашу думку, трэба яшчэ прапаваць над вобразам. Для гарачага і нават «сумаброднага» Гофмана з яго агнявымі парывамі ён некалькі пасіўны. Тым не менш, выканавец уносіць у вобраз шмат абаяння.

Зусім процілеглае можна сказаць аб выканаўцу ролі Ліндорфа-Капеліуса артыстам В. Таланкіным. Драматычна ён вырашыў сваю ролю таленавіта, але ў вакальных адносінах не дасягае паўнаты.

Заслужаная артыстка БССР Л. Аляксеева ўмела правяла цяжкую, патрабуючую вялікага напружання ролю лялькі Олімпіі. Яна паказала выдатную каларатурную тэхніку.

Роля куртызанкі Джульеты праведзена артысткай Р. Крыцці, не гледзячы на яе добрыя галасавыя даныя, усё-ж бледна. Тут трэба кінуць папрок рэжысёру, які не дасягнуў патрэбнага раскрыцця творчай індывідуальнасці выканальніцы.

Вобраз Антоніі, створаны народнай артысткай БССР Р. Млодэк, захапляе сваёй непасрэднасцю, глыбінёй лірыкі, дасканаласцю. Гэта складаная партыя выконваецца ёю з вялікім пачуццём і майстэрствам.

Радуе поспех артысткі Г. Цэпавай, якая выступіла ў ролі Ніклауса, сябра Гофмана. Яе выкананне гэтай мужчынскай ролі вылучаецца трапнасцю і тэмпераментнасцю. Добры, гучны голас у артыста Д. Аўдзеенкі, які выконваў ролю скрыпача Крэспеля. Неабходна асобна адзначыць выканаўца ролі Франца (слугі Крэспеля) народнага артыста БССР П. Засецкага. Шмат тонкага гумару ўкладвае ён у кожную дэталь сваёй ігры. Ён свабодна бярэ верхнія ноты, здзіўляючы лёгкасцю іх гучання і мэтанакіраванасцю кожнага свайго сцэнічнага палажэння.

З густам праводзяць свае ролі артыст Лапацін (Спаланцані), артысты Аляксандраў і Трахановіч (студэнты). Артыст Царанкоў (гаспадар шынка Лютэр) знаходзіць шмат цікавых фарбаў у сваім вобразе.

Дэкарацыі выкананы па эскізах мастака Б. Матрунiна вельмі стыльна і ўдала вырашаны перспектыўна.

У цэлым спектакль «Казкі Гофмана», які з'яўляецца падагульненнем работы тэатра за мінулы сезон, з усёй відавочнасцю сведчыць аб няўхільным творчым росце калектыва нашай оперы.

Н. СМІРНОЎ.

Летнія гастролі тэатраў

У Карэла-Фінскай ССР гастраліруе Другі Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр. Дзевяць дзён калектыў тэатра знаходзіўся ў гор. Віпуры, дзе паказаў рад сваіх спектакляў. Асабліва цёпла была сустрэта гледачом п'еса Кузьмы Чорнага «Ірынка». 30 мая калектыў тэатра прыбыў у гор. Петразаводск. Тут тэатр паказаў п'есу «Несцерка» В. Вольскага і іншыя спектаклі.

***

На вуліцах Одэсы вісяць шматлікія афішы з беларускім арнаментам. Афішы паведамляюць аб тым, што ў гэтым сонечным украінскім горадзе на гастролях Першы Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга беларускі драматычны тэатр. Калектыў тэатра прыбыў у Одэсу 29 мая. Майстры беларускага мастацтва былі цёпла сустрэты на вакзале прадстаўнікамі грамадскасці Одэсы. 31 мая тэатр паказаў п'есу лаурэата Сталінскай пр[illegible] Кандрата Крапівы «Партызаны». [illegible]мела вялікі поспех у гледача. А[illegible] паказу спектакляў, работнікі тэатра [illegible] вядуць даклады і гутаркі аб мас[illegible] БССР. Намечаны таксама абмерк[illegible] гледачамі асобных пастановак тэа[illegible]

***

Сёння, 7 чэрвеня, у Гомелі [illegible] гастролі тэатра рускай драмы [illegible] Фінскай рэспублікі. У рэпертуа[illegible] п'есы: «Апошнія» М. Горкага [illegible]скія куранты» Н. Пагодзі[illegible] Остроўскага, «Адмірал Нах[illegible]скага.

На рэспубліканскай канферэнцыі кіраўнікоў тэатральнай самадзейнасці

Гэтымі днямі адбылася рэспубліканская канферэнцыя кіраўнікоў тэатральнай самадзейнасці, скліканая для падвядзення вынікаў Усесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці па БССР. На канферэнцыю ў Мінск з'ехаліся лепшыя кіраўнікі тэатральнай самадзейнасці, загадчыкі дамоў соцкультуры і дамоў народнай творчасці.

Мастацкі кіраўнік цэнтральнага Дома народнай творчасці Д. Жукаў зрабіў даклад аб выніках Усесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці па БССР. У спрэчках па дакладу выступілі тт. Санковіч (Вілейская вобласць), Міхайлоўскі (калгас імя Сталіна, Гродненскага раёна), Траянаў (Магілеўская вобласць), Кукраш (Слуцк), Юдзік (Беласток), Камянецкі (Віцебская вобласць), Фрыдман (Пінская вобласць), Сляпян (Мінск) і інш. Усе выступаўшыя гаварылі аб росце гурткоў мастацкай самадзейнасці, але адзначалі абмежаванасць рэпертуару—малую колькасць новых п'ес на беларускай, польскай і яўрэйскай мовах.

З цікавасцю праслухалі ўдзельнікі канферэнцыі даклад С. Гершэнзона на тэму «Савецкі тэатр».

З асаблівай увагай выслухалі ўдзельнікі канферэнцыі выступленне сакратара ЦК КП(б)Б па прапагандзе тав. Гарбунова, які заклікаў удзельнікаў канферэнцыі не спыняцца на дасягнутых поспехах, а ўсямерна развіваць мастацкую самадзейнасць. Тав. Гарбуноў заклікаў удзельнікаў тэатральнай самадзейнасці прыняць актыўны ўдзел у культурным абслугоўванні важнейшых участкаў народнага будаўніцтва ў рэспубліцы.

Удзельнікі канферэнцыі з вялікім уздымам, пад бурныя апладысменты, паслалі прывітальную тэлеграму вялікаму правадыру, лепшаму другу і бацьку беларускага народа, таварышу Сталіну.

Самадзейнае мастацтва — на службу радзіме

У БССР зарэгістрыравана 3.342 самадзейных мастацкіх калектывы, якія аб'ядноўваюць 52.953 спевакоў, чытальнікаў, актораў, музыкантаў, мастакоў. Рабочыя, калгаснікі, служачыя аддаюць мастацтву свой адпачынак, задавальваюць у шматлікіх гуртках свае культурныя патрабаванні і выконваюць вялікую грамадскую работу па культурнаму абслугоўванню працоўных.

Надзвычай яркім узорам гэтага можа служыць нядаўна прайшоўшы Усесаюзны агляд тэатральнай самадзейнасці. Агляд тэатральнай самадзейнасці прайшоў па БССР на вялікім ідэйна-палітычным узроўні і спрыяў шырокаму развіццю самадзейнага мастацтва, спрыяў больш глыбокай і сур'ёзнай рабоце калектываў над рэпертуарам, спрыяў падняццю палітычнай актыўнасці тэатральнай самадзейнасці.

Для кіраўніцтва аглядам была створана рэспубліканская камісія ў складзе 13 чалавек. Для непасрэднага кіравання аглядам і для аказання рэгулярнай метадычнай дапамогі калектывам мастацкай самадзейнасці было створана 10 абласных камісій і 193 раённых. Усім самадзейным тэатральным калектывам, палітінспектарам, загадчыкам хат-чытальняў і ДСК была паслана метадычная літаратура і 9.608 экземпляраў п'ес. Для асобных калектываў былі арганізаваны, па прыкладу Магілеўскага ДНТ, 22 апорных кансультацыйных пункты, галоўным чынам пры тэатрах абласнога значэння і пры буйных клубах.

У парадку падрыхтоўкі да агляду было праведзена 60 семінараў з адрывам і без адрыву ад вытворчасці для кіраўнікоў гурткамі мастацкай самадзейнасці. Для аказання творчай і арганізацыйнай дапамогі гурткам сіламі работнікаў дамоў народнай творчасці і запрошаных спецыялістаў было арганізавана 518 выездаў у раёны БССР.

Да першага туру агляду па рэспубліцы налічвалася 426 калектываў, к канцу агляду іх было ўжо 1.757. У аглядзе прынялі ўдзел: у першым туры—1.268 калектываў, у другім — 543.

Цікавую работу правялі па Мінскай вобласці гуртюк фабрыкі імя Кагановіча, які паставіў п'есу «Наша сям'я» Гінгольда, і калектыў Чэрвеньскага дома соцкультуры, які з поспехам справіўся з пастаноўкай п'есы «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы.

Мастацка-праўдзівы спектакль стварыў калектыў клуба імя Леніна (Гомель), які паставіў на сваёй сцэне п'есу «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка. Драматычны калектыў калгаса «Кастрычнік», Перахоўскага раёна, з поспехам паставіў «Партызаны» К. Крапівы. Асаблівай пахвалы заслужыў сваёй ігрой калгаснік Павел Ларчык у ролі дзеда Бальця.

Цікава паставілі п'есу «Васса Жэлезнова» М. Горкага (у перакладзе на польскую мову) драмгуртюўцы шклозавода Беластоцкай вобласці. Тэатральны гурток Беластоцкага клуба чыгуначнікаў паказаў на аглядзе «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага.

Добра працуе драматычны гурток Лельчыцкага дома соцкультуры. У рэпертуары гэтага гуртка: «Пагранічнікі» Біль-Белацэркоўскага, «Партызаны» К. Крапівы, «Мая маці» Гергеля, «Каварства і любоў» Шылера і інш. У гуртку прымае ўдзел шмат калгаснікаў. Лепшымі выканаўцамі роляў у спектаклях з'яўляюцца 70-гадовы калгаснік з калгаса «Чырвоны араты» Нікалай Журовіч, 67-гадовая калгасніца Еўдакія Журовіч, калгаснікі Наймарк, Ляховіч і інш.

Тэатральныя калектывы Гайнаўскага лесазавода і Клешчэльскага дома соцкультуры выклікаліся ў Брэст для паказу сваіх аглядавых спектакляў працоўным горада. Спектаклі трансліраваліся па радыё.

Лёзненскі дом соцкультуры паказаў на аглядзе «Жаніцьбу» Гогаля, а Расонскі — «Лес» Астроўскага.

Добра працавалі многія драматычныя гурткі Вілейскай, Пінскай і Баранавіцкай абласцей. Так, драмгурток Заможскай хаты-чытальні, Браслаўскага раёна, добра паставіў п'есу «Пінская шляхта» Дуніна-Марцінкевіча. За спектакль «Цыганы» (інсцэніроўка па Пушкіну) драматычны калектыў калгаса імя Сталіна, Пастаўскага раёна, прэміраван. Кіраўнік гуртка пры Казлоўскай хаце-чытальні, Дунілаўскага раёна, Глафіра Самковіч пры ўдзеле ўсяго калектыва гуртка напісала п'есы «Чырвоная хустка», «Хто асушыў слёзы», «Прысята» і «Аршулька», якія і ставіліся ў гэтым гуртку, карыстаючыся поспехам у гледача.

На адно з першых месц па Вілейскай вобласці выйшаў драмгурток Смаргонскага дома соцкультуры. У яго рэпертуары п'есы «Калгуння», «Гершэле Астраполер» і інш. Дырэктар мясцовай школы тав. Пу... любоўна падрыхтоўвае кожны спектакль гуртка. Спектаклі Смаргонскага самадзейнага тэатра карыстаюцца заслужаным поспехам у гледача.

...вішкі гурток паказаў «Гразу» ..., а Ашмянскі — «Вялікі выйгрыш» Шолам-Алэйхема, Докшыцкі — «Славу» Гусева.

Па Баранавіцкай вобласці вялікай папулярнасцю карыстаюцца калектывы Людвішскага дома соцкультуры і Стаўбцоўскай пальчатачнай фабрыкі, якія паставілі спектаклі «Любоў Яравая» Трэнёва і «200.000» Шолам-Алэйхема.

За час агляду выяўлена шмат здольных удзельнікаў і грамадскіх кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. У аглядзе прыняло ўдзел 17.970 гурткоўцаў. За час агляду самадзейнымі калектывамі было абслугавана 394.000 гледачоў, створан 1.331 новы тэатральны калектыў. Гурткі тэатральнай самадзейнасці ў часе першага і другога туру агляду паказалі на клубных сцэнах 1.007 спектакляў, з іх класікі — 156, савецкіх п'ес — 512, на абаронную тэматыку — 332.

Асабліва праявілі сябе ў кіраўніцтве мастацкай самадзейнасцю і арганізацыі агляду работнікі Мінскага абласнога Дома народнай творчасці т.т. Гальштэйн і Альхова, Палескага — тав. Кучар, Вілейскага — тав. Генін і інш.

Але поспехі былі-б значна большымі, калі-б усе тэатральныя калектывы былі забяспечаны метадычнай літаратурай і дастатковай колькасцю цікавых п'ес на беларускай, польскай і яўрэйскай мовах, калі-б была наладжана сталая шэфская дапамога і шырокая выхаваўчая работа з гурткоўцамі. Зусім недастаткова, а то і проста не займаліся мастацкай самадзейнасцю органы народнай асветы, раённыя камітэты камсамола і прафсаюзныя арганізацыі. Хоць пры БРК саюза работнікаў мастацтваў і была створана шэфская камісія, але яна абмежавалася толькі скліканнем шэфскай канферэнцыі ды абяцаннямі.

Агляд паказаў, што выраслі новыя кадры грамадскіх кіраўнікоў самадзейнасці, колькасна і якасна вырас лік гурткоў, палепшыўся і папоўніўся іх рэпертуар поўнацэннымі савецкімі п'есамі.

Для замацавання здабытых поспехаў і далейшага развіцця тэатральнай самадзейнасці ў рэспубліцы дамам народнай творчасці камсамольскім, прафсаюзным арганізацыям і органам народнай асветы трэба аказваць штодзённую дапамогу гурткам, кіраваць іх работай. Часцей трэба склікаць семінары і канферэнцыі па творчай вучобе, наладжваць творчы абмен вопытам.

Усю работу калектываў мастацкай самадзейнасці трэба падначаліць задачам, якія пастаўлены XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыяй. Пачэсны абавязак удзельнікаў самадзейнасці — дапамагаць сродкамі мастацтва справе камуністычнага выхавання мас, барацьбе за бліскучае выкананне гаспадарчых планаў, за павышэнне прадукцыйнасці і культуры працы, за ўмацаванне абараназдольнасці нашай радзімы.

Д. ЖУКАЎ.

Дзяржцырк

Першая праграма

23 мая Мінскі дзяржаўны цырк пачаў свой летні сезон. Першая праграма аказалася вельмі ўдалай і цікавай. Некаторыя выканаўцы не здолелі прыбыць к адкрыццю сезона, але і без іх змест праграмы значны, насычан цікавымі выступленнямі.

Цырк заўсёды застаецца цыркам, г. зн. папулярным народным відовішчам. Савецкі цырк па якасці выконваемых на арэне выступленняў расце з году ў год, і папулярнасць цырка ў народзе ўзрастае разам з яго мастацкім ростам. Гэта прыкметна па першай праграме Мінскага цырка, якая вышэй мінулагодніх праграм. Ёсць нумары лепшыя, ёсць горшыя — але агульны ўзровень праграмы сапраўды цыркавы, поўнасцю здавальняючы патрабаванні масавага гледача.

Лепшым, вядучым і як-бы цэментыруючым усю праграму нумарам з'яўляецца стайня дрэсіраваных коней пад кіраваннем М. Штэйна. Выступленне гэтага маладога дрэсіроўшчыка з вялікай і добра натрэніраванай стайняй бліскуча абвяргае ўзнікшую за апошні час думку, што цыркавая стайня стала нуднай і захоўваецца на манежы цырка па традыцыі — з пашаны да яе, як да родапачынальніцы цыркавой арэны. Не ў прыклад многім дрэсіроўшчыкам, якія робяць выезды па надакучыўшаму шаблону, без выдумкі і запалу, стайня Штэйна ў яе першым выездзе паказала заезды ў паскораным тэмпе і цікавым рысунку, што стварае ўражанне эмацыянальнай насычанасці ўсяго нумара. Працуючы ў выдатнай манеры вядомага дрэсіроўшчыка коней Ефімава, Штэйн аблагародзіў свой нумар мяккасцю абыходжання з коньмі і непрымусовасцю паводзін на манежы. Гэта, безумоўна, выдатны дрэсіроўшчык.

Жакеі Еўстаф'евы дапаўняюць конную частку праграмы. Выступленне іх рознастайнае і смелае. Старэйшаму Еўстаф'еву перашкаджае некалькі залішняя гарачнасць у рабоце, але ўвесь нумар чоткі, цікавы і глядзіцца з напружаннем.

Дасканала працуюць веласіпедысты Норланд, але адчуваецца, што яны здольны на большае, чым тое, што паказана ў праграме.

Трупа пад кіраўніцтвам Аляксандрава (ікарыйскія гульні) добра знаёма мінскаму гледачу па выступленнях мінулых сезонаў. Нажаль, гэты здольны калектыў нічога не зрабіў новага за апошнія годы.

Выступленне вядомай цыркавой артысткі Тамары Брок цікавае ў частцы трансфарміравання касцюмаў і агульнага стылю афармлення нумара, але жангліраванне не з'яўляецца арыгінальным, і выступленне цікава толькі напалову.

Да ліку своеасаблівых і цікавых нумараў трэба аднесці работу жанглёра Сі-у-Лі. Нумар пабудаван проста, непасрэдна, разлічан на вялікі эфект. І актор умелым выкананнем стварае гэты эфект.

Атракцыён «Марскія львы ў акварыуме» у пастаноўцы Т. Сідоркіна пры ўдзеле Тамары Брок не належыць да ліку «знагзбіваючых» атракцыёнаў, але пакарае некаторай навізной, добрай дрэсіроўкай марскіх ластаногіх, асвяжаецца ўдзелам у ім плаўцоў-спартсменаў Андрэевай і Сарокінай. Нумар з'яўляецца па-сапраўднаму цыркавым і добра прымаецца гледачом; ён лёгкі для ўспрыняцця і ўносіць у праграму асвяжаючую рознастайнасць.

Артысты Антонаў і Барценеў (Пат і Паташон) — выдатныя клоуны. У іх шматлікіх антрэ шмат дасціпнасці, вынаходлівасці. Яны забаўляюць публіку без грубасцей, стрымана, з вялікім тактам і культурна. Ва ўсёй праграме яны неабходны, і прадстаўленне шмат страціла-б без іх удзелу.

Глядач крыху нездаволен прысутнасцю ў праграме сатырыкаў Барысоўскай і Тарахно. Магчыма, што яны і здольныя акторы для эстрады, але на манежы, у праграме сапраўдных цыркавых нумароў, яны выглядаюць блёкла і нецікава. Усё тыя-ж бытавыя жарты, «куплетцы» на злобу дня, беспрынцыпная песенька «Трое». Усё гэта надзвычай надакучыла гледачу, тым больш у цырку. Сатыра ў цырку добра прымаецца ў выглядзе буфанады, калі яна падаецца ў гучнай, чоткай фразе, з сярэдзіны манежа, калі яна насычана смелай, арыгінальнай вайстрынёй. Але калі так-званыя сатырыкі выступаюць дя галоўнага выхаду, ды яшчэ з рэпертуарам, які з году ў год, з праграмы ў праграму паўтарае адно і тое-ж, дык атрымліваецца ў лепшым выпадку нярпімае, а ў большасці — беднае выступленне.

Наогул-жа першая праграма Мінскага цырка можа быць аднесена да ліку добрых і вартых увагі патрабавальнага гледача сталіцы.

В. ГЛАЗЫРЫН.

Абмеркаванне аповесці М. Паслядовіча

У секцыі празаікаў ССП БССР 5 чэрвеня адбылося абмеркаванне аповесці М. Паслядовіча «Магістральны канал». Уступнае слова зрабіў Кузьма Чорны. У абмеркаванні прынялі ўдзел тт. М. Лынькоў, А. Кучар, Р. Мурашка, В. Барысенка Е. Садоўскі, Н. Сурначоў і П. Кавалёў.

Усе выступаўшыя прызналі, што аўтар добра ведае сялянскі быт, таму рад персанажаў абрысаван ім у бытавым разрэзе з тонкім веданнем справы. Большая частка аповесці напісана роўна, паэтычна, хаця аўтар не ўсюды здолеў развязаць добра завязаныя сюжэтныя вузлы. Вобразы «Магістральнага канала» не ўзняты на вышыню філасофскага абагульнення, як гэта зроблена ім у рамане «Паўстанне» з вобразам Пятра Ашмана.

Тая частка аповесці, у якой разгортваюцца падзеі вакол магістральнага канала, займае параўнальна малое месца ў творы, таму некаторыя падзеі скамечаны аўтарам, а паасобныя героі, як дзед Брыль, проста зніклі з твора. Мова гэтай часткі твора мае на сабе налёт публіцыстычнасці, часам сухая, нявобразная. Прычынай гэтага з'явілася, пэўна, паспешная праца аўтара над творам без далейшай паглыбленай апрацоўкі.

Бадай усе выступаўшыя пагадзіліся на тым, што Паслядовіч у гэтай аповесці выказвае здольнасці цікавага апавядальніка, не пазбаўленага тонкага гумару, але яму неабходна ўзняцца над бытавой абмежаванасцю сваіх герояў і прымусіць чытача разам з героямі твора думаць над складанымі пытаннямі жыцця.

Р. М.

Заняткі ў лекторыі пісьменнікаў і работнікаў мастацтваў

Лекторый для пісьменнікаў і работнікаў мастацтваў Беластока свае трэція заняткі прысвяціў азнаямленню з творчасцю геніяльнага рускага кампазітара П. І. Чайкоўскага. Лекцыю аб музычнай спадчыне Чайкоўскага прачытаў кампазітар тав. Цэнтнершвер. Сімфанічны аркестр Беластоцкай філармоніі пад кіраваннем дырыжора А. Дэмбо выканаў урыўкі з 5-й і 6-й сімфоній Чайкоўскага і з балетаў «Спячая красуня» і «Лебядзінае возера».

На чацвертых занятках, якія адбыліся 1 чэрвеня, пісьменнікі і работнікі мастацтваў з вялікай цікавасцю праслухалі лекцыю сакратара Беластоцкага абкома партыі тав. Эльмана «Марксісцка-ленінскае вучэнне аб мастацтве». Гэта—другая лекцыя тав. Эльмана на гэту тэму.

Беласток. **(Наш кар.).**

Каб зніклі балоты...

Тэкст М. Клімковіча   Музыка С. Палонскага



2. Давайце на-славу парэжам канавы,
Каб люба было паглядзець,
Каб, едучы ў госці, сусед нам
зайздросціў
На стог ды на поўную клець!
Прыпеў: Зямля савецкая... і г. д.

3. Асушым балоты, засеем з ахвотай
Мы зернем адборным палі.
Хай новае поле і добрая доля
Красуе на нашай зямлі!
Прыпеў: Зямля савецкая... і г. д.

Літаратурныя даклады ў Баранавічах

У баранавіцкім Доме партыйнай асветы для партыйных работнікаў, агітатараў і працоўных горада часта арганізуюцца даклады і платныя лекцыі на літаратурныя тэмы. У апошні час інспектарам ГарАНА тав. Ржэўскім прачытан даклад аб творчасці Салтыкова-Шчэдрына, навуковым работнікам абласнога Інстытута павышэння кваліфікацыі настаўнікаў тав. Фрэтавым—даклад «Паэзія Уладзіміра Маякоўскага».

Даклады і лекцыі на літаратурныя тэмы чытаюцца заўсёды пры перапоўненай зале.

М. К.

Вл. Нефёд

Аб тыповым

Мастацкая творчасць узнікае як выражэнне неадольнай унутранай патрэбнасці мастака выразіць свае адносіны да акружаючай яго рэчаіснасці. Мастак цесна і непарыўна звязан з рэчаіснасцю, таму што ён сам з'яўляецца часткай грамадскага быцця; яго жыццё — толькі частка арганічна-адзінага цэлага грамадскага жыцця. Мастак, калі ён мае права так называцца, перш за ўсё грамадскі работнік, верны сын свайго народа, сваёй краіны.

Сапраўдны мастак-паэт нараджаецца самім жыццём. Само жыццё натхняе яго, нараджае ў ім мыслі і пачуцці, пабуджаючыя тварыць. Натхняе праўда жыцця!

Праўдзівы, адпавядаючы рэчаіснасці твор мастацтва мы называем рэалістычным.

Энгельс так акрэсліў рэалізм: «На мой погляд, — пісаў ён, — рэалізм мае на ўвазе, апрача праўдзівасці дэталей, правільнасць перадачы тыповых характараў у тыповых абставінах».

У гэтай кароткай формуле Энгельса сказана ўсё, што патрабуецца ад мастака: тыповыя характары ў тыповых абставінах! Але часта, паўтараючы гэту формулу, мастакі не паглыбляюцца ў яе сапраўдную сутнасць.

Што значыць — тыповыя характары ў тыповых абставінах? Што значыць само паняцце тыповага?

Здавалася-б, што тыповай мы можам назваць такую з'яву, якая атрымала распаўсюджанне, якая мае масавы характар. Гэта ў асноўным правільна. Але сказаць толькі гэта, значыла-б дапусціць вялікую памылку. Тыповае — гэта не сінонім масавага. І гэта далёка не адно і тое-ж. Можна прывесці рад прыкладаў, калі, не з'яўляючыся масавай, з'ява робіцца тыповай.

Возьмем, для прыкладу, 1925—1927 годы, калі калгасы ў краіне налічваліся адзінкамі. Амаль уся сельская гаспадарка трымалася на дробна-таварнай вытворчасці. Але дзяржаўная сістэма, самы лад былі соцыялістычнымі. А соцыялістычная сістэма гаспадаркі дыктуе неабходнасць пераходу ўсёй сельскай гаспадаркі на соцыялістычныя рэйкі, г. зн. на шлях кааперацыі. Так дыктавала само жыццё. Другога шляху для сялянства не было. І ўжо ў гэтыя годы пачалі паяўляцца калгасы. Спачатку іх было мала. Яны не мелі масавага пашырэння. Але ці можна было лічыць калгасы ў той час тыповай з'явай? Вядома! Тыповай з'явай жыцця яны былі ў той час таму, што ў перспектыве мелі вялікую будучыню.

Возьмем другі прыклад. Стаханаўскі рух, пачынаючы з 1936 года, атрымаў шырокае распаўсюджанне. Ён ахапіў велізарныя масы працоўных. А ці-ж узнік ён нечакана? Ці-ж так шпарка распаўсюдзіўся-б ён, калі-б не падрыхтоўваўся папярэднімі гадамі ўпартай соцыялістычнай працы? Вядома, не! Але чаму-ж нашы мастакі загаварылі аб стаханаўскім руху (гутарка ідзе не аб самай назве, а аб сутнасці руху) толькі тады, калі ён стаў масавым? Чаму мастакі не выявілі стаханаўцаў, якія задоўга да 1936 года паказвалі ўжо ўзоры стаханаўскай працы? Ды таму, што мастакі часта замест таго, каб тварыць, г. зн. ствараць новае, паказваць руху шляхі наперад, самі ідуць на повадзе ў жыцця і ледзь паспяваюць за ім. Таму, што яны не здолелі разглядзець тыповай з'явы тады, калі яна была яшчэ ў зачатку.

Значыць, тыповае не абавязкова шукаць там, дзе з'явы набылі ўжо масавы характар. Тыповае нараджаецца тады, калі наспяваюць неабходныя для гэтага ўмовы. І задача мастака — выявіць яго задоўга да таго, пакуль яно разаўецца ў масавае. Калі-ж за тыповае браць толькі масавае, дык мы заўсёды адстанем ад жыцця, бо жыццё ідзе наперад, з'явы развіваюцца, змяняюцца адна другой. І тое, што сёння з'яўляецца масавым, заўтра ўжо будзе пройдзеным этапам, яно ўзнімецца на новую ступень, прыме новыя формы і якасці і будзе развівацца далей.

Не ўсякая масавая з'ява бывае абавязкова тыповай. Возьмем той-жа прыклад з 1925—1927 год, калі ў вёсцы пераважала дробна-таварная гаспадарка. Ці-ж можна гаварыць аб тым, што яна была тыповай для соцыялістычнай сістэмы гаспадаркі? Вядома, не! Яна была масавай, але не тыповай. Тыповымі былі калгасы. Важна прасачыць тэндэнцыю, па якой схільна развівацца тая ці іншая з'ява, знайсці, куды яна накіравана, ці мае даныя для развіцця. І тады ўсё стане ясным. Тады мы беспамылкова вызначым, што ёсць тыповае.

Іншы раз можна трапіць у заблуджэнне і прыняць за тыповае — эпізадычнае, не характэрнае для часу. Правяраць з'яву трэба на тым, куды яна схільна развівацца. Такі падыход да ацэнкі тыповага будзе адзіна правільным. І толькі неразуменнем гэтага можна вытлумачыць тую акалічнасць, што ў нашай драматургіі, напрыклад, на працягу доўгага перыяду, пачынаючы з 1936 і канчаючы 1939 годам, паяўляліся пустыя, нікому не патрэбныя творы аб шпіёнах і дыверсантах, а затым аб здрадзе, рэўнасці, разбітым каханні і г. д. Калі меркаваць аб нашым жыцці па гэтых творах, дык выходзіць, што гэта і ёсць тое галоўнае, што займала нас. А вялікія справы і падзеі нашага часу — нараджэнне новага чалавека, новых адносін да працы, праблемы новай сям'і і шлюбу драматургі прагледзелі.

Калі мастак хоча спрыяць дасягненню нашай агульнай мэты, ён павінен дапамагаць выхаванню працоўных мастацкімі сродкамі. А выхоўваць мастак можа толькі тады, калі ён сам з'яўляецца перадавым чалавекам і, па меры свайго таленту, прыадчыняе заслону будучыні.

Мы павінны вучыцца ў класікаў уменню з усёй глыбінёй ускрываць грамадскія з'явы шляхам мастацкага выяўлення іх і тыповага абагульнення.

Вядома, якой папулярнасцю карысталася ў свой час кніга Чэрнышэўскага «Што рабіць?» А чаму? Ды таму, што ў гэтай кнізе Чэрнышэўскі гаварыў аб новых людзях, аб новых адносінах, якія ў яго час, вядома, не мелі распаўсюджання, але мелі месца ў жыцці. І заслуга яго ў тым і заключаецца, што ён, убачыўшы ў жыцці парасткі новага, развіў іх і паказаў у сваёй кнізе абагуленымі. І якое вялікае значэнне мела гэта кніга ў справе выхавання людзей, у справе фарміравання новых, соцыялістычных адносін! Нездарма і зараз моладзь зачытваецца гэтай кнігай.

А. М. Горкі ў большасці сваіх п'ес паказвае разлажэнне свету ўласнікаў. Але гэты паказ быў-бы няпоўным, калі-б ён разам з разлажэннем аднаго свету не паказаў нараджэнне новага. І таму ў яго «Мяшчанах», напісаных да рэвалюцыі 1905 года, мы сустракаем Ніла, а ў «Вассе Жэлезновай» — Рашэль,—прадстаўнікоў новага жыцця. І ў «Егору Булычову» гэта новае жыццё ўрываецца ў вокны булычоўскага дома.

У прамой сувязі з пытаннем аб падыходзе да тыповага стаіць пытанне аб вядучым метадзе савецкага мастацтва — соцыялістычным рэалізме.

М. І. Калінін у сваім выступленні на сходзе работнікаў мастацтваў гор. Масквы (1939 год) сказаў: «Соцыялістычны рэалізм выяўляецца яшчэ і ў тым, што ён рысуе не толькі новыя рысы, якія кідаюцца ў вочы ўсім, але і такія рысы, якія не ўсякі заўважае, але якія тым не менш з'яўляюцца тыповымі, якія пашыраюць кругагляд і адкрываюць новыя перспектывы». Соцыялістычны рэаліст, гаворыць тав. Калінін, «павінен сваім творам штурхаць на развіццё чалавечай мыслі, на развіццё лепшых імкненняў чалавека. Соцыялістычны рэаліст сваімі творамі павінен штурхаць людзей на лепшае, благароднае, узвышанае...»

Соцыялістычны рэалізм, як метад савецкага мастацтва, ужо даўно бытуе ў творах савецкага мастацтва. Рад спроб не толькі ў галіне літаратуры, але і ў галіне драматургіі стварыць творы аб людзях соцыялістычнага грамадства ўвянчаўся поспехам. Савецкая драматургія па-праву ганарыцца такімі творамі, як «Любоў Яравая», «Аптымістычная трагедыя», «Платон Крэчат», «Хто смяецца апошнім», «У стэпах Украіны» і інш. Вось дзе трэба шукаць і вырашаць усе праблемы, звязаныя з нараджэннем новага метада мастацтва, метада соцыялістычнага рэалізма. А ў нас часам гэтыя пытанні вырашаюцца ў сферы чыста-тэарэтычных спрэчак.

Метад соцыялістычнага рэалізма абумоўліваецца адной важнейшай умовай — служэннем справе соцыялізма. Мастак павінен быць тонкім назіральнікам жыцця, ён павінен пранікаць ва ўсё, бачыць усё. Але толькі назіраць — мала для савецкага мастака. Савецкі мастак павінен сам актыўна ўдзельнічаць у барацьбе за новае жыццё. Задача савецкіх мастакоў заключаецца ў тым, каб сілай свайго мастацкага чуцця і прадбачання быць наперадзе і паказваць руху шляхі наперад.

Узяць хоць-бы асушку балот Беларусі. Гэта пытанне займае зараз пісьменнікаў, паэтаў, драматургаў. Многія распрацоўваюць гэтую тэму. Але хацелася-б напомніць, што і на гэту выдатную тэму можна напісаць дрэнны твор. І гэта здарыцца ў першую чаргу з тымі аўтарамі, якія імкнуцца на новай актуальнай тэме паказаць толькі сябе, ці хто разумее асушку балот у вузкім сэнсе слова.

Якая велізарная і захапляючая тэма для мастака — асушка беларускіх балот! Гэта штурм прыроды, якая павінна быць падначалена чалавеку — гаспадару соцыялістычнай зямлі. Якія велізарныя магчымасці прадастаўляюцца тут мастаку для паказу савецкага чалавека, як твара па шчаслівага жыцця ўсяго чалавецтва, і разам з тым для паказу нараджэння ў соцыялістычнай працы новага ўсведамлення, новых людзей.

Што можа быць больш узвышаным і благародным гэтай справы і гэтай тэмы для мастака!

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394.